ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ (з дармовым дадаткам „Прафрух“)

На 1 мес.	— 90 к.
„ 3 мес.	2 р. 60 к.
„ 6 мес.	5 р. —
„ 12 мес.	9 р. 75 к.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА“ Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ

За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., іншагародняя абвесткі—1 р. за радок. Посярод тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Зьвыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. надбавкі.

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЬ!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	10-74
Сакратар	6-19
Партсэктар	13-80
Сэктар інфармацыі	13-80
Начны рэдактар	6-42
Галоўная кантора	7-81
Аддзел падпіскі	7-81
„ абвестак	7-81

НЯДЗЕЛЯ, 20 ліпеня 1930 г.

№ 167 (3765)

Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

Выразна ажыцьцёвіць дырэктывы партыі аб ліквідацыі акруг

Арганізавана перабудавацца на-хаду

Недапушчальны ніякія дэмабілізацыйныя настроі

(Гутарка з сакратаром ЦК КП(б)Б тав. ВАСІЛЕВІЧАМ)

Вялікія зрухі ў клясавых узаемаадносінах у нашым краі, паварот асноўных мас сялянства ў бок сацыялізму, ліквідацыя кулацтва, як клясы, на базе суцэльнай калектывізацыі, кіраўніцтва ўсімі гэтымі вялікімі працэсамі, —ўсё гэта ставіць пытаньне аб рашучым узмацненьні раёнаў, якія сталі асноўным зьвяном сацыялістычнага будаўніцтва на вёсцы. Раён зьяўляецца тым рашаючым вучасткам клясавага змаганьня на вёсцы, на які партыя і рабочая кляса павінна перакінуць шмат сваіх лепшых сіл.

Вынікі бальшавіцкай веснавой сяўбы на Беларусі таксама, як ва ўсім Савецкім Саюзе, першыя вынікі змаганьня за калектывізацыю, гавораць аб вялізарных перамогах партыі і рабочае клясы аб правільнай ленінскай палітыцы партыі, аб поўным правале і банкрутстве прадказаньняў правых апартуністых, аб тым, што партыя своечасова ўдарыла па «левых» перагібах, якія скажалі лінію партыі ў справе калектывізацыі.

Адначасова ход калектывізацыі па БССР паказаў слабасьць вясковай партыйнай арганізацыі, слабасьць раённага савецкага апарату. Тав. Сталін зусім правільна адзначае ў сваім дакладзе: «Ці выстарчальна забясьпечаны патрэбнымі работнікамі раённыя арганізацыі для таго, каб узьняць усю гэту рознастайную работу? Ня можа быць сумненьня. Ня можа быць сумненьня, што яны забясьпечаны работнікамі надзвычай невыстарчальна. Што трэба зрабіць для таго, каб выправіць гэты недахоп і забясьпечыць раённыя арганізацыі ва ўсіх галінах клясавай работы выстарчальнай колькасьцю патрэбных работнікаў?—пытаецца тав. Сталін і адказвае: «дзеля гэтага трэба зрабіць прынамсі дзьве рэчы: 1) ліквідаваць акругі, якія ператвараюцца ў непатрэбнае «средоточение» паміж вобласьцю і раёнам, і за лік вызваленых акруговых работнікаў узмацніць раённыя арганізацыі; 2) зьвязаць раённыя арганізацыі непасрэдна з вобласьцю (крайкомам, нацЦК)».

Таму зьезд ухваліў пастанову ЦК аб ліквідацыі акруг і падкрэсьліў, што «гэта мерапрыемства мае выключна важнае значэньне для ўзмацненьня партыйнай арганізацыі на вёсцы, а таксама для паляпшэньня і спрашчэньня сувязі ЦК і абласьцей з месцамі».

Ажыцьцяўленьне пастановы ЦК УсеКП(б), якая апублікавана ў адным з апошніх нумароў «Зьвязды», ставіць перад КП(б)Б цэлы рад важнейшых баявых задач. У параўнаўча кароткі тэрмін (бо да пачатку новага гаспадарчага году, г. зн. да 1-га кастрычніка будуць ліквідаваны акругі) нам трэба перабудаваць усю работу ўсіх нашых органаў. Гэта патрабуе ад партыйнай арганізацыі сапраўдных зьвяшчэнных вясковай партыйнай арганізацыі.

ЦК КП(б)Б гэтымі днямі ўхваліў пастанову аб ліквідацыі акруг да 1-га кастрычніка, у якой ёсьць цэлы рад важнейшых практычных дырэктыў. Бюро ЦК вылучыла камісіі па ўстанаўленьні арганізацыйнай структуры раёнаў і па разьмеркаваньні кадраў. ЦК прыняў пастанову аб тым, каб цэнтральныя ўстановы і наркаматы неадкладна наладзілі непасрэдную сувязь з раёнамі, каб яны неадкладна пачалі даваць дырэктывы непасрэна раённым цэнтрам.

ЦК папярэджвае аб тых адмоўных зьявішчах, якія заўважаюцца ў сувязі з ліквідацыяй акруг.

Трэба рашучым чынам ліквідаваць усялякія спробы, якія ёсьць ў некаторых мясцох, і якія накіраваны для таго, каб цяпер узбуйніць раёны. Гэта азначала-б на сутнасьці зрыў пастаноў партыі аб ліквідацыі акруг, зьвядзеньне іх на нішто, стварэньне сурагату «ўездаў» і, такім чынам, скрытае захаваньне акруг.

З боку паасобных работнікаў ёсьць жаданьне ўхіліцца ад работы ў раёне. Партыя разглядае гэта, як дэзэртырства, і зробіць з гэтага ўсе адпаведныя вынікі. Партыя прыставіць да ганебнага слупа ўсіх тых, хто прабуе дэзэртыраваць з важнейшых пастоў клясавага змаганьня. Лёзунг — ня менш 90 проц. работнікаў акруговых апаратаў у раёны—павінен быць няўхільна выкананы.

У акругах і ў нас у цэнтры трэба так разьмеркаваць работнікаў, каб даць раёнам адпаведных работнікаў па ўсіх галінах—адміністрацыйных, гаспадарчых, каапэрацыйных, арганізацыйна-прапагандысцкія сілы і г. д. Трэба таксама ўзмацніць цэнтральныя апараты.

Асаблівую ўвагу пры гэтым трэба зьвярнуць на ўзмацненьне вясковай партыйнай арганізацыі.

Работа па ліквідацыі акруг праходзіць у час важнейшых кампаній (уборачная, асеньняя сельска-гаспадарчая, збожжазагатоўкі і г. д.), якія праводзяцца КП(б)Б. Недапушчальны ніякія дэмабілізацыйныя настроі ў правядзеньні гэтых кампаній. Партыя рашуча аддзёрне усіх тых, хто паддаецца «ліквідатарскім» настроям і паспрабуе паслабіць ход гэтых кампаній.

Было-б вялікай памылкай думаць, што правядзеньне такога важнейшага мерапрыемства, якое ўзмоцніць нашы клясавыя пазыцыі, пройдзе, так сказаць, «у парадку самацёку». Ліквідацыя акруг, узмацненьне раёнаў сустрэне (і ўжо сустракае) супраціўленьне з боку клясавага ворага. Кулацтва будзе старацца сарваць гэтае мерапрыемства, ведаючы, што сутнасьць яго—больш пасьпяховае і хуткае сацыялістычнае наступленьне разгорнутым фронтам. Партыя дасьць рашучы адпор гэтым спробам клясавага ворага. Партыя зламае хрыбет правым двурушнікам—агэнтам кулацтва ў нашай партыі, якія таксама прабуюць па практыцы сарваць гэту работу, затрымаць тэмпы яе правядзеньня.

Уся работа, усе мерапрыемствы, зьвязаныя з ліквідацыяй акруг, павінны прайсьці пры актыўнейшым удзеле самых шырокіх мас рабочых, калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў. Недапушчальна «габінэтнае» правядзеньне гэтай важнейшай работы.

Па-хаду з максымальнай арганізаванасьцю правядзем ліквідацыю акруг.



У дзікіх стэпах Троіцкага краю, паміж Казанстанам і Башкірыяй вырастае новы сацыялістычны гігант Магнітастрой. На здымку: будаўніцтва каналізацыі сацыялістычнага гораду.

ПАМЯЦІ ф. Э. Дзяржынскага

найвялікшага рэвалюцыянэра і барацьбіта за справу рабочае клясы, гэроя Кастрычніка, нястомнага змагара за пралетарскую рэвалюцыю

20/VII—1926 г. —20/VII—1930 г.

4 гады назад партыя і рабочая кляса страцілі першага байца бальшавіцкай гвардыі, аднаго з арганізатараў і кіраўнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі — Фэлікса Эдмундавіча Дзяржынскага.

Сярод старых бальшавікоў, якія перанесьлі царскія ссылкі і зьдзекі, якія зьявіліся першымі тварцамі Кастрычніка, адно з першых месц займае адважны барацьбіт камуністычнай рэвалюцыі т. Фэлікс Дзяржынскі.

Яшчэ да Кастрычніка т. Дзяржынскі быў членам тэй пяцёркі, якую Цэнтральны Камітэт партыі вылучыў для падрыхтоўкі паўстаньня.

Перамога дыктатуры пралетарыяту ў нашым краі цесна зьвязана з імем лепшага прадстаўніка партыі т. Дзяржынскага.

Добра вядомы ўсім працоўным СССР і ўсяго сьвету роля і значэньне ВЧК і яе правадыра Дзяржынскага ў часе трохгадовай грамадзянскай вайны.

Буржуазія і яе прыхільнікі на сваёй сьпіне спрабавалі цяжкую руку Фэлікса, якому пралетарыят даручыў абарону дыктатуры пралетарыяту ад шматлікіх контр-рэвалюцыянэраў. Цяжка пералічыць тыя контр-рэвалюцыйныя змовы і паўстаньні, бандыцкія напёты, шкодніцкія акты, якія былі ліквідаваны ВЧК пад кіраўніцтвам т. Дзяржынскага.

З імем Фэлікса Дзяржынскага зьвязаны пэрыяд аднаўленьня народнае гаспадаркі Савецкага Саюзу. Дзякуючы вялікае энэргіі і творчай гаспадарчай рэвалюцыйнай дзейнасьці т. Дзяржынскага, пралетарыяту ўдалося ў кароткі тэрмін аднавіць транспарт, вывесьці яго з стану разрухі.

Вялізныя паслугі т. Дзяржынскага ў справе аднаўленьня прамысловасьці Савецкага Саюзу.

Калі т. Дзяржынскі ўступіў на пост старшыні СНГ СССР, наша прамысловасьць недзь-недзь выбівалася з разрухі. Патрэбны былі нечалавечыя намаганьні, каб падняць з руін фабрык і заводы, аднавіць прамысловасьць, павесьці іх яе да рэканструкцыі.

Адсутнасьць сырцу, абсталяваньня, зваротных сродкаў яшчэ больш паглыблялі цяжкасьці аднаўленьня прамысловасьці. Фэлікс Дзяржынскі не спалохаўся цяжкасьцяй. Апіраючыся на падтрыманьне шырокіх працоўных мас, Дзяржынскі ўзьняў прамысловасьць на даваенны ўзровень.

За гэтыя 4 гады краіна Саветаў прарабіла вялізарнейшую работу ва ўсіх галінах, дасягнуўшы вялізарных посьпехаў як на гаспадарчым, так і на культурным франтох. Практычныя маштабы будаўніцтва па сваёй грандыёзнасьці перавышаюць на многа раз тыя, аб якіх 4 гады таму назад можна было толькі марыць, як пяцігодка, суцэльная калектывізацыя, ліквідацыя кулацтва, як клясы і г. д.

Але разам з вялікімі дасягненьнямі ва ўсіх галінах нашага жыцьця, разам з ростам народнае гаспадаркі растуць і труднасьці нашага будаўніцтва. Мы павінны напружыць усе сілы, каб уся энэргія, энтузіязм рабочае клясы былі выкарыстаны для ўзмацненьня тэмпаў нашага росту, для перамог труднасьцяй, зьвязаных з сацбудаўніцтвам, для выпраўленьня недахватаў у нашай рабоце.

І пры ажыцьцяўленьні гігантскіх задач, пастаўленых партыяй — дагнаць і перагнаць капіталістычныя дзяржавы, мы асабліва адчуваем тую вялізарную ўтрату, якую панесьла наша партыя і край у асобе Фэлікса Эдмундавіча Дзяржынскага — вялічайшага рэвалюцыянэра і барацьбіта за справу рабочае клясы.

Няхай жыве памяць аб вялікім гэрої Кастрычніка — першым чакісьце, вялікім змагару за пралетарскую рэвалюцыю!

Праверым гатоўнасьць да ўборкі ўраджаю

Арганізуем сацспаборніцтва і ўдарніцтва на палёх

Калгас імя Варашылава ўперадзе

Там, дзе арганізацыя працы пастаўлена добра, дзе ёсьць плянавасьць у працы, падрыхтоўка да ўборачнай асеньня-пасеўнай кампаніі праходзіць арганізавана. Гэта мы бачым на прыкладзе сельска-гаспадарчай арцелі ім. Варашылава (Высачаны, Віцебскай, акр.). У арцелі адчуваецца недахоп рабочай сілы, але калгасьнікі, працуючы ўдарнымі тэмпамі, выйдуць з гэтага становішча без пабочнай дапамогі. Да ўборачнай кампаніі арцель поўнасьцю падрыхтавана. Уборачныя машыны прыведзены ў баявы парадак. Памяшканьні для ссыпкі збожжа адрамантаваны. Пляны ўборачнай і асеньня-пасеўнай кампаніі складзены і абгаворана на сходзе калгасьнікаў. Калгасьнікі адносяцца сьвядома да сваіх абавязкаў.

Брыгадзір «Зьвязды» ФРОЛАЎ.



Калгас «Пралетары» (Меншчына). На здымку ўстаўка пілы ў жнявярку перад выездам у поле.

СЕЛЬСАВЕТ УЗЯЎ УДАРНЫЯ ТЭМПЫ

Гэтымі днямі адбыўся пленум Майскага сельсавету, Жлобінскага раёну. Першым пытаньнем быў заслуханы даклад агранома аб падрыхтоўцы да ўборкі ўраджаю і асеньняй пасеўнай кампаніі. Увесь пленум сельсавету на час уборкі і сяўбы абвясьціў с. с. ўдарным і выклікаў Бабацкі сельсавет на сацыялістычнае спаборніцтва. Дагавор заключаны. Зараз сельсавет мабілізуе бядняцка-серадняцкія масы на 100-процантнае выкананьне дагавору. Увесь Майскі сельсавет засяваецца ачышчанымі насеньнем, уборка ўраджаю пачалася і праходзіць з посьпехам. Майскі сельсавет выклікае ўсе сельсаветы БССР пасьпедваць яго прыкладу — уборку ўраджаю і асеньнюю сяўбу правесьці па-баявому і ва ўдарным парадку.

Брыгадзір «Зьвязды» Е. САЛДАЦЕНКА

ЗЯМЛЯЎПАРАДКАВАНЬНЕ ЗАЧЯГ-ЗЯМЛЯЎПАРАДКАВАНЬНЕ ЗАЦЯГ-

Клімавічы, Магілеўскай акр.

Ня ўсім калгасам і індывідуальным гаспадаркам райвыканком адвёў азімы клін. Справе зямляўпарадкаваньня райземчастка аддае мала ўвагі.

Зямельная камісія зацягвае вырашэньне справы зямляўпарадкаваньня. Трактары і плугі, якія ёсьць у калгасах, яшчэ не адрамантаваны.

Брыгадзір «Зьвязды» Н. ШЛЯХЦІЧ

НЕАРГАНІЗАВАНАСЬЦІ І БЯСПЛЯНАВАСЬЦІ

ГАРАДОК, ВІЦЕБСК, АКР.)

Рабочыя брыгады па калгасах не падрыхтаваны. Становішча з цягавай сілай у раёне вельмі дрэннае, асабліва у сувязі з недахопам машын.

Рабочыя пляны ў большасьці калгасаў ня складзены. Спаборніцтва і ўдарніцтва ў калгасах не праводзіцца. Жаночая праца да гэтага часу не арганізавана.

Як райкалгасаюз, так і РВК пытаньнем набыцьця патрэбнага ліку машын у раён не займаліся. Трэба набыць 15 сенакасілак, 26 конных грабель, 15 жнявярак і шмат інш. У многіх калгасах большая частка машын не адрамантавана. Райвыканком і райкалгасаюз у гэтай галіне нічога ня робяць.

Брыгадзір «Зьвязды» ПРАКАПОВІЧ

У 3 раёнах яшчэ не адведзены сенажаці

ВОРША (Наш кар.). Ня гледзячы на тое, што Аршанскі акрвыканком даў дырэктывы аб своячасовай падрыхтоўцы да ўборкі новага ўраджаю, раённымі арганізацыямі Аршаншчыны нічога дагэтуль ня зроблена. Час уборкі наблізіўся. Пляны ўборачнай кампаніі да калгасаў і асобных двароў не даведзены, ўборачнымі машынамі акруга не забясьпечана. Райвыканкомы і іншыя раённыя установы і арганізацыі вельмі халодна» адносяцца да гэтае справы.

Арганізацыя грамадзкага харчаваньня ў калгасах на час уборкі ўраджаю сарвана. Замест 50 часовых сталовак арганізавана толькі адна. У гэтым кірунку нічога ня зроблена спажывецкай сыстэмай і райкалгасасаюзам. Ленш справы абстаіць з арганізацыяй часовых ясьляй і пляцовак.

У Талачынскім, Мсьціслаўскім і Аршанскім раёнах калгасам не адведзены да гэтага часу папарныя клёны і сенажаці. Ні ў водным калгасе акругі ня створаны бюро па арганізацыі працы. Не разгорнута сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва ў калгасах. Над пагрозаю зрыву будаўніцтва памяшканьняў для захаваньня новага ўраджаю. У тых калгасах, дзе пачатая кампанія складзены, праца была праведзена без выстарчальнага ўдзелу калгасьнікаў.

Мілашэўскі.

ЗАБЫЛІ ПРА ІНДЫВІДУАЛЬНІКА

У Лельчыцкім раёне, (Мазырскае акр.) дрэнна ідзе падрыхтоўка да ўборачнай кампаніі ў індывідуальным сэктары.

У раёне пакуль што абмяжоўваюцца пастановай аб аказаньні дапамогі бядняцкім гаспадаркам, якую выпеў раённы камітэт сялянскай узаемадапамогі. Але сельсаветы ў галіне выкананьня гэтае пастановы і ня зьбіраюцца нічога зрабіць. Уліку бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, якім трэба дапамагчы, няма. Аб арганізацыі супраці з бядняцка-серадняцкіх гаспадарак на час уборкі, аб падрыхтоўцы інвэнтару — і гаварыць нават ня прыходзіцца.

Сьпяць і партыйныя, і камсамольскія ячэйкі.

Брыгадзір «Зьвязды» МАХЦІН

Абсьледваньняў многа, а дапамогі няма

У апошні час у Магілеўскі раён прыяжджалі 6 прадстаўнікоў розных партыйных і савецкіх арганізацый для абсьледваньня і праверкі работы раённых арганізацый па падрыхтоўцы да ўборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі. Але ні адзін з іх нічога канкрэтнага не зрабіў, каб дапамагчы раённым арганізацыям у іх рабоце.

У далейшым трэба, каб тыя таварышы, якія будуць прыяжджаць у раён, больш глыбока падыходзілі да абсьледваньня работы, каб яны таксама дапамагалі раённым арганізацыям.

М. А.

Вапнаваньне не праводзіцца

ЛЁЗНА, Віцебскай акругі.

Выкананьне пляну вапнаваньня і сіласаваньня ў Лёзьненскім раёне не забясьпечана. З 440 гэкт. заваапнавана толькі 24. Наяўныя запасы вапны ў калгасах ня выкарыстоўваюцца. Райкалгасасаюз ня даў калгасам выразных дырэктыў адносна вапнаваньня. Вапнаваньне па індывідуальным сэктары зусім не праводзіцца. Сельсаветы лічаць непатрэбным весьці растлумачальную кампанію па вапнаваньні ў індывідуальным сэктары. Ня ленш абстаіць справа і з сіласаваньнем. На сёньнішні дзень у раёне няма ні адной набудаванай сіласнай ямы. Камсамольскія ячэйкі яшчэ нічога практычнага па сіласаваньні не зрабілі.

Брыгадзір «Зьвязды» ФРОЛАЎ.

УСЁ ЧАКАЮЦЬ

Мазырская акруга. З атрымаўшых Мазырскім акраемаддзелам 237 вагонаў вапны ў раёны вывезена толькі 5-6%. Акрпаляводсаюз чакае, пакуль Палескай дасьледчая станцыя выпрацуе гідратэхнічную карту глебы Мазырскай акругі. Ні з калгасьнікамі, ні з бядняцка-серадняцкімі масамі вёскі не вядзецца ніякай работы па папулярызацыі такога капітоўнага мерапрыемства, як вапнаваньне.

Брыгадзір «Зьвязды» І. ТОЎСЬЦІК

Чарговыя задачы вясковых партыйных арганізацый

Вясковыя партыйныя арганізацыі ўступілі ў паласу надзвычай адказнай і вялікай работы. Забясьпечыць своячасовую уборку ўраджаю, правядзеньне збожжазагатовак, забясьпечыць і правесьці першую бальшавіцкую васеньнюю пасеўную кампанію, узьняць новую хвалю калектывізацыі, рэалізаваць пазыку індустрыялізацыі—за чатыры гады» і правільна правесьці с.-г. падатак—такі пералік толькі важнейшых кампаній, якія стаяць перад вясковымі арганізацыямі ў бліжэйшы перыяд.

Натуральна, што з усімі гэтымі задачамі можна спраўціцца толькі пры ўмове правядзеньня зусім яснай і выразнай бальшавіцкай клясавай лініі, пры ўмове бязьлітаснага змаганьня з правымі і «левымі» апартуністамі.

Таму, зараз як ніколі, у сувязі з суадносінамі клясавых сіл вёскі, якія вымяніліся, важна, каб кожны член партыі, кожны камсамолец і вясковы актывісты ўсьвядоміў пастановы XVI зьезду партыі. Сацыялістычная перабудова вёскі зьвязана з клясавым змаганьнем, якое абвастраецца.

Усе адзначаныя вышэй задачы могуць быць вырашаны толькі на грунце разгорнутага наступленьня на ўсе капіталістычныя элемэнты і ў першую чаргу на кулацтва. Зусім відавочна, што вясковыя арганізацыі павінны правесьці рашучае змаганьне з кулацкай агэнтурай у сваіх уласных радох. Трэба пасьледоўна і сыстэматычна ачышчаць партыйныя рады ад правых апартуністых і выкрываць тых, хто прымірэнча да іх настроены.

Сюды павінен быць накіраваны галоўны агонь. Рашучае змаганьне трэба абвясьціць апартуністым, якія не разумеюць неабходнасьці абапірацца на калгасьнікаў. Вялікай заваёвай рэвалюцыі зьяўляецца той факт, што серадняк, які ўвайшоў у калгас, ператвараўся і ў саюзьніка савецкай улады. Серадняк-калгасьнік разам з бедняком, з калгасьнікам у важнейшых збожжавых раёнах зьяўляецца апорай савецкае ўлады. Гэта павінны ўлічыць вясковыя арганізацыі ва ўсёй сваёй практычнай рабоце. У калгасах партыйныя арганізацыі павінны весьці змаганьне з апартуністычнымі тэндэнцыямі, якія атрымліваць сваё выяўленьне, папершае ў спробах адхілець «адшыць» серадняка ад кіраўніцтва калгасамі, і, падругое, у спробе адмовіцца ад сыстэматычнай работы з беднатой у калгасах, ад самастойнай арганізацыі беднаты у ніжэйшых зьвяньнях калектыўнага руху і г. д.

У справе арганізацыі груп беднаты пры сельсаветах, пры каапэрацыі мы вельмі адстаем. На гэты вучастак работы трэба прыналегчы. «Па-за калгасамі,—гаварыў т. Кагановіч у сваім дакладзе на XVI зьезьдзе,—мы павінны абавязкова працаваць з беднатой, бо калі мы ня будзем працаваць з ёй, мы яе ня будзем мець як згуртаваную сілу». Перад партыйнымі арганізацыямі стаіць напярэдадзе вялікая, палітычная, арганізацыйная і культурна-выхаваўчая работа для перамаганьня ўнутры калгасаў дробна-буржуазных хістаньняў. У сувязі з гэтым набывае асабліва шкодны характар апартуністычная недаацэнка ролі батрацтва і беднаты. Практыка зімы гэтага году паказала наколькі шкодна падмяняць палітычную работу ў масах адміністраваньнем, націскам і гвалтам у адносінах да серадняка і бедняка. Зьезд у сваёй рэзалюцыі па справаздачы ЦК паказаў на недапушчальнасьць ігнараваньня індывідуальніка, на неабходнасьць разгортваньня шырокай масавай палітычнай работы і ўцягненьня індывідуальнікаў у калгасы. «Партыя павінна працягваць бязьлітаснае змаганьне з «левымі» антысярэднякоўскімі перагібамі, якія больш чым калі-небудзь у даны час граюць на руку кулаку і праваму апартунізму». (З рэзалюцыі па справаздачы ЦК).

Трэба забясьпечыць выразную работу ўсіх прывадных пасаў партыі да беспартыйных мас, павярнуць усе вясковыя арганізацыі, саветы, каапэрацыю шчыльна тварам да калгаснага будаўніцтва. Каапэрацыя павінна заняцца масавай работай. Трэба ўзьняць на значно большую вышыню работу вясковых камсамольскіх арганізацый. Зараз, як ніколі, трэба перамагчы настроі недаацэнкі і ігнараваньня работы сярод жанчын. Умацаваньне абароназдольнасьці краю, пралетарскай дыктатуры, сацыялістычная перабудова вёскі, разгорнутае наступленьне пралетарыяту патрабуе колькаснага і якаснага ўзмацненьня вясковых партыйных арганізацый. Сетка ячэек на вёсцы надзвычай малая. Самі ячэйкі вельмі малалікія. Бліжэйшы пэрыяд павінен стаць пераломным у справе стварэньня магутнай арганізацыі на вёсцы, якая апіралася-б перш за ўсё на калгасы. Мы маем вялікія рэзервы для росту партыі з асяродзьдзя сельска-гаспадарчых рабочых, батракоў і лепшых калгасьнікаў. Павінна быць таксама узьнята якасьць саміх ячэек. Трэба даб-

Баявая задача

Ліпеньскія пляны загатовак буйной рагатай жывёлы выканаць на ўсе 100 проц.

Тэлеграма сакратара ЦК КП(б)Б т. Васілевіча акругкомам

ЦК канстатуе злачыннае невыкананьне плянаў загатовак буйной рагатай жывёлы ў ліпені месяцы. Гомель выканаў 20 проц. пляну, Мазыр—17 проц., Магілеў—13 проц., Менск—11 проц., Ворша—9 проц., Віцебск— 6 проц., Полацак—4 проц.

Гэтакае агіднае выкананьне плянаў зрывае забесьпячэньне Чырвонай арміі і рабочых і ня можа быць далей цярпімым.

ЦК ускладае пэрсанальную адказнасьць на сакратароў акругкомаў і старшынь акрвыканкомаў за поўнае выкананьне ліпеньскіх плянаў загатовак буйной рагатай жывёлы.

ЦК ставіць перад усёй вясковай партарганізацыяй, камсамольскай арганізацыяй, адпаведнымі савецкімі, каапэрацыйнымі і гаспадарчымі органамі баявую задачу—100 проц. выкананьне плянаў загатовак буйной рагатай жывёлы ў ліпені. У кожнай арганізацыі павінны быць вылучаны таварышы, якія пэрсанальна адказваюць за выкананьне плянаў загатовак мяса.

ЦК патрабуе бязумоўнага выкананьня дырэктыў «Белмяса» па разьмеркаваньні жывёлы і мяса, у прыватнасьці без цяганіны выконваць поўнасьцю ўсе заданьні па дастаўцы мяса ў Менск.

ЦК катэгарычна забараняе выдатканьне мяса без нарадаў.

ЦК папярэджвае, што ў адносінах да тых, хто будзе забараняць вывозіць мяса па нарадах «Белмяса» з акруг і раёнаў, хто замест выкананьня нарадаў будзе займацца месьніцтвам і цяганінай, ЦК прыме рашучыя меры.

Сакратар ЦК КП(б)Б ВАСІЛЕВІЧ.

Гэраічная барацьба кітайскага пралетарыяту

ШАНХАЙ, 17. На працягу цэлага месяца бастуюць 800 рабочых трамваю на французкай канцэсіі ў Шанхаі. Ня гледзячы на прасьледваньні ўлады і жорсткія напады гаміндаўскага друку, бастуючыя энэргічна дамагаюцца сваіх патрабаваньняў. Імі неадпокрыць спынилася работа электрастанцыі і водаправоду. Сёньня да бастуючых далучыліся вагонаважатыя, кандуктары і іншыя рабочыя трамваю і аўтабусаў, якія дагэтуль не баставалі. Працуе толькі некалькі вагонаў, якія абслугоўваюцца белагвардзейскімі штрэйкбрэхэрамі.

Падпольны орган кітайскай кампартыі «Шанхай Бао» паведамляе, што на ініцыятыўне шанхайскае рады прафэсыянальных саюзаў быў скліканы сход на пытаньні аб барацьбе супроць вайны. На сходзе прысутнічала 40 дэлегатаў ад 20 арганізацый. Пастаноўлена весьці барацьбу супроць мілітарыстычных войн і зьвязаных з гэтым павялічэньнем рабочага дня і пагоршаньнем агульнага становішча рабочых, супроць рацыяналізацыі прамысловасьці, якую зьбіраюцца правесьці Нанкін і кітайскія прамыслоўцы, за скарачэньне рабочага дня і павялічэньне зарплаты, супроць самавольных звальненьняў рабочых, супроць прасьледваньняў рабочых на фабрыках і заводах супроць закрыцьця прафсаюзных арганізацый і арышту рабочых, якія шырока практыкуюцца гаміндаўскай уладай, за вызваленьне арыштаваных рабочых правадыроў і за вынаньне з Кітаю рускіх белагвардзейцаў, што выступаюць штрэйкбрэхэрамі пры кожнай забастоўцы кітайскіх рабочых.

(ТАСС).

Мабілізацыя пралетарскіх сіл да баявых выступленьняў 1-га жніўня

ДЭМАНСТРАЦЫЯ МІЖНАРОДНАЙ САЛІДАРНАСЬЦІ

БЭРЛІН, 16. Камуністычныя партыі Нямеччыны, Францыі, Бэльгіі, Галяндыі і Люксэмбургу апублікавалі сумесную адозву да рабочых аб правядзеньні 3 жніўня ў Штольбэргу ў Аахэне **дэманстрацыі рабочых гэтых пяці краёў супроць імпэрыялістычнай вайны, супроць капіталістычнай вайны, супроць капіталістычнай экспляатацыі.**

Лёзунгі дэманстрацыі: «Прэч плян Юнга», «Прэч антысавецкія ваенныя пляны капіталістых», «Няхай жыве міжнародная салідарнасьць рабочых і сялян»

РАБОЧЫЯ НЯМЕЧЧЫНЫ РЫХТУЮЦЦА ДА КОНТРНАСТУПЛЕНЬНЯ

БЭРЛІН, 17. Падрыхтоўка рэвалюцыйнага пралетарыяту Нямеччыны да масавых выступленьняў у антыімпэрыялістычны дзень 1 жніўня праходзіць у абстаноўцы вельмі ўзмоцненага капіталістычнага выступленьня на рабочую клясу і росту фашысцкай небясьпекі.

Таму нямецкая кампартыя зьвязвае падрыхтоўку да 1 жніўня з агітацыяй за контр-наступленьне пралетарыяту супроць капіталу і фашызму.

Рэвалюцыйная прафапазыцыя прымае ўсюды энэргічныя меры для стварэньня на прадпрыемствах органаў адзінага фронту і рэвалюцыйных фабзаўкомаў супроць наступленьня капіталу і для барацьбы за 7-гадзінны рабочы дзень і павялічэньне заработнай платы.

Гэтыя органы пралетарскага контр-наступленьня павінны адначасова выконваць на прадпрыемствах функцыі камітэтаў па падрыхтоўцы і правядзеньні антыімпэрыялістычнага дня 1 жніўня. Падрыхтоўка да 1 жніўня ўвязваецца з падрыхтоўкай да 5 кангрэсу Камінтэрну.

НІВОДНАГА ЦЭНТА НА ЎЗБРАЕНЬНЕ

НЬЮ-ЁРК, 16. Орган амэрыканскай кампартыі «Дэйлі Ўоркэр», гаворачы аб беспрацоўі і аб падрыхтоўцы капіталістычнага сьвету да вайны, піша: **«Урад Злучаных Штатаў, ня гледзячы на тое, што ў краі больш 8 млн. беспрацоўных, траціць мільярды на ўзбраеньне, а на дапамогу беспрацоўным ніводнага цэнту».**

Газэта высоўвае лёзунгі: «Ніводнага цэнту на ўзбраеньне, усе ў фонд дапамогі беспрацоўных».

Далей газэта заклікае рабочых прымаць удзел у дэманстрацыі 1-га жніўня пад кіраўніцтвам кампартыі і лігі прафсаюзнага адзінства і пад лёзунгам «супроць вайны, за абарону Савецкага Саюзу, за страхаваньне ад беспрацоўя».

КРЫВАВАЯ РАСПРАВА САЦ.-ФАШЫСТЫХ НАД РАБОЧЫМІ

ВЕНА, 18. Орган аўстрыйскай кампартыі «Рота Фане» паведамляе, што сход скліканы кампартыяй у Нэйкірхэнэ для абмеркаваньня цытаньня па падрыхтоўцы да 1 жніўня, на які, ня гледзячы на забарону паліцыі, зьявілася 800 рабочых, скончыўся сурёзнымі сутычкамі з жандарамі і сацыял-дэмакратычнай вартай. Дакладчык-камуністы арыштаваны. Цяжка паранены адзін рабочы і адна работніца. Напад жандараў і варты выклікаў абурэньне сярод рабочых, у прыватнасьці сярод сацыял-дэмакратычных рабочых, якія паладзілі бурныя дэманстрацыі пратэсту. Некалькі членаў шуцбунду парвалі свае членскія білеты.

* * *

ПАРЫЖ, 17. Рэакцыйны друк патрабуе забароны першажніўненьскай дэманстрацыі, якую арганізоўвае кампартыя і унітарныя прафсаюзы.

Роспуск Нямецкага рэйхстагу

48 ПАРАГРАФ У ДЗЕЯНЬНІ

НОВЫЯ ВЫБАРЫ—14 ВЕРАСЬНЯ

БЭРЛІН, 18. Рэйхстаг прыняў большасьцю **236 галасоў** камуністычных, сацыял-дэмакратаў, нацыянал-сацыялістых і нямецкіх нацыяналістых групы Гугенбэрга супроць **221 голасу** дэпутатаў урадавых партый і нямецкіх нацыяналістых групы Вэстарпа прапанову сацыял-дэмакратаў **аб адмене падатковых мерапрыемстваў, прынятых урадам на подставе дыктатарскага параграфу 48.**

Пасьля таго, як сталі вядомы рэзультаты галасаваньня, **рэйхсканцлер Брунінг агалосіў дэкрэт прэзыдэнта Гіндэнбурга аб роспуске рэйхстагу.** Дэпутаты пакінулі будынак рэйхстагу **пры бурных сцэнах.**

БЭРЛІН, 18. Зараз-жа пасьля роспуску рэйхстагу габінэт міністраў прыняў пастанову **назначыць на 14 верасьня новыя выбары ў рэйхстаг.**

Бюджэт 1930 г., які ня быў поўнасьцю абмеркаваны рэйхстагам, будзе цяпер **цэлкам дэкрэтаваны Гіндэнбургам.** Паколькі рэйхстаг пастанавіў знуляваць дэкрэты, выданыя на падставе дыктатарскага параграфу 48, дык яны па канстытуцыі не маюць законнай сілы. На пасяджэньні ўраду абараняўся пункт погляду, што ўрад з свайго боку павінен аннуляваць гэтыя дэкрэты, прычым Гіндэнбург можа ізноў аднавіць іх з некаторымі фармальнымі зьменамі.

Габінэт пастанавіў зьвярнуцца з маніфэстам да «нямецкага народу».

Пілсудзкі пакідае пост вайсковага міністра?

ВАРШАВА, 18. Прэзыдэнт Масьціцкі падпісаў дэкрэт аб назначэньні віцэ-міністра вайсковых спраў генэрала Канаржэўскага часовым кіраўніком вайсковага міністэрства. З моманту назначэньня Канаржэўскі ўваходзіць у склад рады міністраў на правах поўнапраўнага члена і падпісвае ў якасьці вайсковага міністра ўсе патрэб

Выкінем з радоў партыі агентаў кулацтва—правых апартуністых,

ВЫКРЫЕМ ІХ І НОВЫЯ МАНЭЎРЫ ДВУРУШНІЦТВА

Прапрацоўкай і выкананьнем пастаноў XVI зьезду яшчэ больш узмоцнім ідэёвую і арганізацыйную баяздольнасьць бальшавіцкіх радоў

За лінію партыі

Армейскія бальшавікі былі, ёсьць і будуць непахісной апорай ленінскага ЦК

Ордэн Леніна—т. Сталіну

16-га ліпеня ў «Чырвоным Урочышчы» адбыўся агульна-лятерны партыйны сход, які заслухаў даклад Нач. Палітуправы БВА т. **Аранштама** аб выніках XVI зьезду ўсеКП(б). Ва ўхваленай рэзалюцыі па дакладу т. Аранштама, між іншым, гаворыцца:

Заслухаўшы і абмеркаваўшы даклад т. Аранштама аб выніках XVI зьезду УсеКП(б) **партыйны сход лягеру «Чырвонае Урочышча» цалкам і поўнасьцю дапучаецца да ўсіх пастаноў зьезду і з бальшавіцкім здаваньненьнем канстатуе, што XVI зьезд ленінскай партыі зьявіўся зьездам вялікіх гістарычных пастаноў.**

Сход канстатаваў, што XVI зьезд УсеКП(б) даў правільны аналіз міжнароднаму становішчу СССР, сусьветнаму эканамічнаму крызису, які ўсё паглыбляецца, і новаму рэвалюцыйнаму ўздыму.

Забесьпячэньне бальшавіцкіх тэмпаў індустрыялізацыі краю, якія ўзмацняюць баяздольнасьць СССР, зьяўляецца лепшай гарантыяй міру і перамогі сацыялізму. XVI зьезд усклаў на Чырвоную армію вялікія задачы па абароне сацыялістычнага будаўніцтва нашага краю. Гэта абавязвае партыйныя арганізацыі яшчэ больш павялічыць тэмпы ўздыму баявой гатоўнасьці часьцей як нашага лягеру, так і ўсёй Чырвонай армі.

Партсход вітае пастановы XVI зьезду, якія выразна, па-бальшавіцку вызначылі далейшую праграму вялікага будаўніцтва сацыялізму, далейшага разгорнутага сацыялістычнага наступленьня на капіталістычныя элементы гораду і вёскі. На аснове дасягнутых посьпехаў і на аснове пастаноў XVI партыйнага зьезду, пад кіраўніцтвам ленінскай УсеКП(б), рабочая кляса выканае пяцігодку за чатыры гады. На аснове росту сацыялістычнай прамысловасьці, — гаворыцца далей у рэзалюцыі, — ажыцьцяўленьнем суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыяй кулацтва, як класу, на гэтай базе мы завершым пабудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі ў Савецкім краі.

XVI зьезд партыі аддаў вялікую ўвагу нацыянальному пытаньню, якое ва ўмовах Беларусі і ва ўмовах вайсковых нацыянальных часьцей набывае вялікае значэньне. Сацыялістычнае будаўніцтва як у Беларусі, так і ў іншых нацыянальных рэспубліках Савецкага Саюзу, немагчыма бяз цьвёрдага ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі, без рашучага змаганьня супроць вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі ў нацыянальным пытаньні супроць мясцовага шавінізму, супроць беларускага нацыянал-дэмакратызму і шавінізму ўсіх колераў.

Партсход адзначае вялізарнае адзінства, якое прадэманстравана XVI зьездам УсеКП(б) у радок нашай партыі, і згуртаванасьць партыйных мас вакол ленінскага Цэнтральнага Камітэту на чале з ленінцам-бальшавіком т. Сталіным.

XVI зьезд выразна па-бальшавіцку выкрыў правы апартунізм, як кулацкую агентуру ўнутры нашай партыі, і зусім правільна абвясьціў погляды правай апазыцыі нясумнячальнымі з прабываньнем у радох УсеКП(б).

«Пакуль ня зломлена і не ліквідавана кулацтва ў нашым краі, правы апартунізм будзе заставацца галоўнай небясьпекай унутры нашай партыі». Спробы вымяшаць гэтую небясьпеку павінны сустрэць самы рашучы адпор з боку ўсёй партыі. Разам з тым, партыйны сход падкрэсьліў, што партарганізацыі, змагаючыся з правым апартунізмам, як **галоўнай** небясьпекай, павінны бязьлітасна біць па «левых» загібах, па рэшткам контр-рэвалюцыйнага трацкізму, па прымірэнчых адносінах да ўхілаў ад ленінскай лініі партыі.

Партыйны сход лічыць нездавальняючым прызнаньне былымі лідэрамі правай апазыцыі сваіх памылак і канстатуе, што лідэры правых, фармальна прызнаўшы свае памылкі, на справе не вялі змаганьня з правым апартунізмам.

Пастановы XVI зьезду УсеКП(б) павінны стаць уласнасьцю шырокіх чырвонаармейскіх мас, каманднага складу, усіх партыйных і камсамольскіх арганізацый. Сход абавязвае ўсе партыйныя ячэйкі безадкладна прыступіць да глыбокай прапрацоўкі і вывучэньня ўсіх пастаноў XVI зьезду УсеКП(б).

Партыйны сход запэўнівае ЦК, што партарганізацыя лягеру «Чырвонае Урочышча» была, ёсьць і будзе вернай апорай ленінскага ЦК УсеКП(б) у яго змаганьні супроць усіх тых, хто прабуе сьцягнуць партыю з правільнага бальшавіцкага шляху.

Партарганізацыя яшчэ больш згуртуецца вакол генэральнай лініі партыі, вакол ленінскіх пастаноў XVI зьезду. З свайго боку партыйная арганізацыя ўжыве ўсе захады да поўнага выкананьня гэтых пастаноў.

Партыйны сход хадайнічае перад ЦВК СССР аб узнагародзе т. **Сталіна** ордэнам Леніна.

Нэхай жыве УсеКП(б)!

Нэхай жыве ленінскі ЦК і тав. Сталін!

Бабруйскі партактыў аб выніках XVI зьезду

БАБРУЙСК, 19. (па тэлефону). Учора адбыўся сход актыву бабруйскай акруговай партарганізацыі, які заслухаў даклад аб выніках XVI зьезду Усе КП(б). У рэзалюцыі актыў цалкам і поўнасьцю ўхваляе пастановы зьезду і дапучаецца да іх. Актыў з вялікім здаваньненьнем канстатуе, што XVI зьезд ва ўсёй сваёй рабоце праходзіў пад знакам ленінскага адзінства, пад знакам непрымірымага змаганьня супроць правых і «левых» апартуністых і прымірэнчых адносін да іх.

Актыў лічыць своячасовай і поўнасьцю ўхваляе пастанову ЦК і XVI зьезду Усе КП(б) аб ліквідацыі акруг і ўзмацненьні раёнаў. Актыў прапануе ўсёй партыйнай арганізацыі ў адпаведнасьці з пастановамі ЦК зараз-жа прыступіць да практычнай рэалізацыі гэтых пастаноў. Актыў у сваёй пастанове заклікае ўсю партарганізацыю, усіх рабочых зараз-жа прыступіць да вывучэньня пастаноў зьезду і да безадкладнага ажыцьцяўленьня іх.

У паход за паперу

Паварот глушыцелоў рабочай ініцыятывы

Зьнішчыць надбайныя адносіны да рабочых прапаноў

Што тармозіць выкананьне прамфінпляну

Да сканчэньня гаспадарчага году засталося крыху больш 2 месяцаў, і цяпер ужо можна падвесьці адпаведныя вынікі, — з чым мы скончым гаспадарчы год.

А вынікі вельмі дрэнныя. Ёсьць пагроза, што гаспадарчы год будзе скончаны з прарывамі, г. зн. што мы ня выканалі тых абавязкаў, якія ўзялі перад партыяй і перад усёй рабочай клясай СССР. Гэта сьведчыць аб тым, што ня ўсе сродкі былі мабілізаваны для выкананьня прамфінпляну і што заводакіраўніцтвы і фабкомы ня ўсе арабілі, каб дапамагчы рабочым і ўдарнікам выканаць іх абавязкі, узятыя імі ў нарадку сацспаборніцтва.

Прыводжу некалькі прыкладаў, якія сьведчаць аб тым, што заводакіраўніцтвы і цэхадміністрацыя ня толькі не дапамагалі, а наадварот, тармазілі ініцыятыву рабочых.

ФЗК Добрускай фабрыкі «Гэрой Працы», заслухаўшы даклад заводакіраўніцтва аб выкананьні прамфінпляну, канстатаваў, што выкананьне прамфінпляну ідзе дзякуючы таму, што заводакіраўніцтва несвячасова выконвае прапановы рабочых. Гэта бывае з прычыны плутаніны работы мэханічнай майстэрні з вытворчым цэхам, недастатковай увагі цэхадміністрацыі і цэхкому на мабілізацыю рабочай думкі на выкананьне прамфінпляну.

Можна прывесьці шмат прыкладаў, якія, бязумоўна, ня спрыяюць выкананьню прамфінпляну. Галоўнае гэта—адсутнасьць элементарнага, якое да гэтага часу не даведена да цэху.

Ёсьць недахопы і з боку рабочых: прагулы і наогул надбайныя адносіны да сваёй работы.

На фабрыцы «Гэрой Працы», па сваіх надбайных адносінах, рабочы пансаваў сетку. Заводакіраўніцтва дае дырэктыву зьняць з работы гэтага рабочага, а цэхадміністрацыя ня выконвае загад заводакіраўніцтва і праз якія-небудзь 3-4 дні гэты самы рабочы зноў пансаваў сетку.

Такіх недахопаў можна прывесьці шмат, як на фабрыцы «Гэрой Працы», так і на іншых фабрыках, не гаворачы аб тым, што ёсьць шмат прагулаў, прастою на фабрыках і няма патрэбнага рэагаваньня з боку заводскіх арганізацый.

Апошняе, што, бязумоўна, ня можа спрыяць выкананьню прамфінпляну, гэта тое, што з боку заводакіраўніцтва і «Белпаперы» ніхто не падхапіў ініцыятывы рабочых і ўдарнікаў па выкананьні пяцігодкі ў 3 а палавінай гады, а гэтакая магчымасьць, бязумоўна, ёсьць.

Характэрна адзначыць такі факт, што калі на фабрыцы рабочы актыў высунуў лёзунг «Пяцігодку—за 3 з палавінай гады» і калі пастанавілі парад заводакіраўніцтвам пытаньне, каб яно праверыла гэтыя магчымасьці, дык у заводакіраўніцтва зусім не аказалася пяцігодкі.

Гэта ўсё маленькая частка тых недахопаў, якія ня спрыяюць выкананьню і перавыкананьню прамфінпляну, бо іх ёсьць шмат.

Аклад спаборніцтва ў змаганьні за паперу, які цяпер праводзіцца, дасьць магчымасьць выявіць усе недахопы і зьнішчыць іх, а таксама дасьць магчымасьць за гэтыя **два месяцы зрабіць, пт.,** трэба.

Рабочыя папіровай прамысловасьці, бязумоўна, прымуць актыўны ўдзел у гэтай кампаніі, пачынаючы ад рабкораў і канчаючы ўсімі рабочымі.

Старшыня ЦК саюзу паперникаў

ГНІЛЯКЕВІЧ.

Усебеларуская нарада па партасьвеце

Падвышэньне тэарытычнага ўзроўню—ўзброіць партыйныя масы на выкананьне задач, намечаных 16 партзьездам

Агонь па апартуністычнай недаацэнцы рэвалюцыйнай тэорыі

За неадкладную перабудову ўсёй сыстэмы нашай партыйнай асьветы, за ўдарныя тэмпы падрыхтоўкі да новага навучальнага году

ВОПЫТ ГОМЕЛЯ—Ў ІНШЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ

Гомельшчына на гэты раз фігуравала на нарадзе, як піянэр у справе набыцьця некаторага добрага вопыту ў справе пастаноўкі партыйнай асьветы. Аб гэтым гаворыць ня толькі т. **Ашаровіч**, які дакладваў аб вопыце Гомельшчыны, але і сьцены пакою, дзе адбываецца нарада, тымі плякатамі і дыяграмамі, лёзунгамі і памяткамі і шматлікімі друкаванымі газэтамі—аднаднёўкамі, спэцыяльна выпушчанымі райкомамі Гомельшчыны па пытаньнях партыйнай вучобы.

Гэтыя газэты, пісаныя ў большай частцы рукамі слухачоў партшкол і гурткоў гаворыць выразна аб тым, як у Гомелі ўвязваецца вывучэньне рэвалюцыйнай тэорыі з рэвалюцыйнай практыкай, як разгортвалася ўдарніцтва, сацыялістычнае спаборніцтва паміж школамі, гурткамі, асобнымі партыйцамі.

Бязумоўна і ў Гомелі не без прарываў.

— Спачатку навучальнага году—кажа тав. Ашаровіч партвучобай было ахоплена 40 проц. арганізацыі. Фактычна скончылі школу 32 проц. Склад прапагандыстых і дагэтуль не адпавядае запатрабаваньням. І таму ёсьць значны адсеў з прычыны нездавальненьня пастаноўкай вучобы.

Агульны ахоп камуністых вучобай усімі відамі па Гомельскай арганізацыі да канца навучальнага году складаў 50-60 проц. З іх партасьветай было ахоплена 32 проц. Зьнішчыць адставаньне справы партвыхаваньня ад агульных тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, стварыць патрэбны пералом у гэтых адносінах—адна з асноўных задач.

— Першае, што мы павінны былі зрабіць—гэта вызначыць дні вучобы. І мы дабіліся пэўных дзён для вучобы. Другая задача—падцягнуць адсталыя ячэйкі. У Сталінскім залізнёвым раёне райком прысылаў брыгады ў ячэйкі з мэтай наладжаньня там партвучобы. Гэтыя брыгады, якія працавалі два месяцы, склікалі сходы тых камуністых, якія адсяляліся, як мы называем «супраціўлень цаў», гутарылі з імі, вызвучалі прычыны адсеву. У выніку значная частка камуністых вярнулася ў школы. У школах работа стала праводзіцца ўдарнымі мэтадамі.

Мы правялі агляд партвучобы ў друку не па лініі школ, а па лініі ячэек, праводзілі ўдарніцтва ў школах. Асобныя таварышы, або групы бралі на сябе ў асноўным тры абавязкі: быць ударнікам на сваім прадпрыемстве, акуратна наведваць школу, за кароткі тэрмін беларусізавацца. Гэтае ўдарніцтва было распаўсюджана ў горадзе і поўнасьцю сябе апраўдала.

НА РАШУЧУЮ БАРАЦЬБУ З АПАРТУНІСТЫЧНАЙ НЕДААЦЭНКАЙ ПАРТАСЬВЕТЫ

Аб лўнай недаацэнцы партвучобы ў розных мясцох гаварылі многія ўдзельнікі нарады.

— Мы невыстарчальна рэзка ставім пытаньне аб змаганьні з дзяліцтвам, як разнавіднасьцю апартунізму, паваход асобных фактаў дзяліцкіх адносін да рэвалюцыйнай тэорыі, не ствараем патрэбнага шуму, каб на гэтых прыкладах партарганізацыям магла, рашуча змагацца за ўзбраеньне рэвалюцыйнай тэорыяй.

Ёсьць выпадкі, што асобныя камуністыя, якія вучацца ў вячэрніх тэхнікумах, курсах дрэнна адносяцца да грамадзянаўства, кажучы: «Падайце нам тэхнічныя дысцыпліны—палітыкі нам ня трэба (Ашаровіч, Гомель).

— Калі настойліва патрабуюць ад РК рашучай барацьбы са зрывамі партвучобы,—член РК кажа: «Перш за ўсё эканоміка, а на ёй ужо будуецца палітыка, так што пачакай з вучобай» (**Халадок**, Бабруйшчына).

— На Мазырыншчыне,—гаворыць прадстаўнік праграмы ЦК УсеКП(б) **Грышукоў**—дзе нам прыходзілася працаваць—вывяўся надзвычай нізкі палітычны ўзровень у некаторых партарганізацыях. На апошнім сходзе партактыву Мазырыншчыны мы мелі выступленьне аднаго дырэктара такога зьместу: «Выступіш—табе прышыюць які-небудзь ухіл, між тым, як для гэтага няма ніякіх падстаў, таму што палітычна напісьменны».

З боку парткамітэтаў,—гаворыць тав. Грышукоў,—заўважваецца яўная недаацэнка тэарытычнай вучобы. Гэта адбіваецца цяпер і ў справе прапрацоўкі пазаецца цяпер і ў справе прапрацоўкі пазаецца цяпер і ў справе прапрацоўкі паза

Пазыка „Пяцігодка — за чатыры гады“

Пазыка перамогі сацыялізму

Шырэй разгарнуць сацспаборніцтва на лепшую падпіску

Пад грамадзкі кантроль работу камісій садзейнасьці

Вялікі посьпех пазыкі ў Менску

Калектыў Белжылсаюзу ўжо зрабіў заяўку на замацаваньне аблігацый

Кампанія рэалізацыі новай пазыкі ў Менску пашыраецца з кожным днём. Да 16 ліпеня ў горадзе праведзена 40 сходаў па ўстановах і прадпрыемствах. Рабочыя і служачыя прымаюць гарачы ўдзел у абгаварэньні пытаньняў аб новай пазыцы. У радзе ўстаноў рабочыя і служачыя добраахвотна падпісваюцца на 75—100 проц. заработку.

На ЗАВОДЗЕ «КАМУНАР» папярэдняя падпіска па 3-х цэхах складае 8.500 руб. Усе камуны, брыгады і цэхі заводу ахоплены сацыялістычным спаборніцтвам. Агульная падпіска на заводзе дасягае 75 проц. месячнага заработку.

Рабочыя ў сваіх пастановах вітаюць рэалізацыю пазыкі «Пяцігодка за чатыры гады», якая павінна забясьпечыць выкананьне баявога лёзунгу рабочае клясы.

Бляшаны цэх заводу «Камунар» абвясьціў сябе ўдарным па правядзеньні падпіскі і выклікаў кавальскі цэх.

Учора ў дзяржбанк паступіла першая заяўка на замацаваньне аблігацый пазыкі «Пяцігодка — за чатыры гады». Першым зрабіў заяўку калектыў Белжылсаюз на суму 4.035 рублёў.

62 проц. месячнага заработку

ПОЛАЦАК, (наш. кар.). Калектыў служачых ашчадкасы № 474 у поўным складзе падпісаўся на пазыку «Пяцігодка — за чатыры гады». Падпіска дала 62 проц. месячнага заработку.

Калектыў пастанавіў выклікаць на спаборніцтва служачых Полацкага аддзяленьня дзяржбанку, калектыў фінаддзелу, сампрамсаюз і віцебскую ашчадную касу.

Раёны не падрыхтаваліся да кампаніі

15-га ліпеня пачалася рэалізацыя новай пазыкі, але дагэтуль ня ўсе раёны Меншчыны падрыхтаваліся да правядзеньня гэтай кампаніі.

Ня гледзячы на тое, што раёны своечасова атрымалі кантрольныя лічбы і ўсе патрэбныя матар'ялы, падрыхтоўка пакуль ня рухаецца наперад. Значная частка раёнаў Меншчыны дагэтуль не падабрала контрагентаў, не разьмеркавала кантрольныя лічбы паміж агентурай.

У некаторых раёнах матар'ялы спакойна хаваюцца ў сталох РВК, аб існаваньні іх ня ведае нават і падатковы інспэктар. Яшчэ дагэтуль большасьць раённых камісій Меншчыны ня склалі плянаў правядзеньня рэалізацыі.

Пухавіцкая раённая камісія, замест выразнага разьмеркаваньня кантрольных лічбаў паміж контрагентамі, давяла кантрольныя лічбы да самых дробных устаноў і прадпрыемстваў, вызначыла ім цьвёрдыя заданьні. Такое разьмеркаваньне кантрольных лічбаў зьяўляецца парушэньнем дырэктыў вышэйшых органаў.

У некаторых раёнах праведзены агульныя сходы, на якіх прыняты пастановы аб падпісцы на месячны заработак.

Між тым, ёсьць пэўныя дырэктывы, што пастановы агульных сходаў неабавязковы для падпісчыкаў, што кампанія павінна праводзіцца пад лёзунгам «Двухтыднёвы заработак у пазыку дзяржаве».

Зусім зразумела, што кожны рабочы і служачы можа падпісацца і на месячны заработак, мы павінны заахвочваць гэту ініцыятыву, але ні ў якім разе недапушчальна правядзеньне калектыўнай падпіскі на месячны заработак.

ІНСПЭКТАР.

Першыя дні падпіскі ў Воршы

ВОРША (наш кар.). Па акрузе павінна быць рэалізавана аблігацый новай пазыкі на суму 1.187 тысяч рублёў. З гэтай сумы сярод сэзоннікаў павінна быць рэалізавана 164 тыс., сярод рабочых і служачых 647 тыс., рэшта — сярод сялян.

Акруговая камісія садзейнасьці ўжо разьмеркавала ўсю суму пазыкі па асобных калектывах і раёнах.

Аршанская каса ашчаднасьці правяла 8 сходаў па калектывах; Крэдытнае т-ва правяло 9 сходаў, на якіх рабочым і служачым растлумачвалі ў чым сутнасьць новай пазыкі.

Падпіска па ўстановах, якія абслугоўваюцца крэдытным т-вам, дасягнула 10.000 рублёў. Праз некалькі дзён будуць атрыманы аблігацыі новай пазыкі для абмену іх на аблігацыі ранейшых пазык. Адначасова будуць атрыманы табліцы розыгрышаў усіх пазык, каб у часе абмену выплачваць і выйгрышы. Для выплаты выйгрышаў прадстаўнікі крэдытных устаноў выедуць на прадпрыемствы і ў калгасы.

Акруговая камісія садзейнасьці пастанавіла зараз-жа правесьці перавыбары тых нізавых камісій садзейнасьці, якія ня вдолелі справіцца з сваімі абавязкамі.

Копыская камісія, напрыклад, яшчэ не ўзялася за работу па рэалізацыі новай пазыкі.

А. М.

Як рэалізуецца пазыка ў сельскіх мясцовасьцях

Рэалізацыю пазыкі ў сельскіх мясцовасьцях праводзяць сельсаветы, ашчадныя касы, раённыя крэдытныя т-вы пад кантролем РВК. Рэалізацыя пазыкі праводзіцца шляхам продажу аблігацый як за наяўны разьлік, так і з растэрміноўкай плацяжоў па намінальнай цане.

У калектыўнай падпісцы з растэрміноўкай плацяжу могуць прымаць удзел рабочыя і служачыя сельскіх прадпрыемстваў і ўстаноў, калгаснікі, сяляне, якія ўваходзяць у камуны, т-вы, члены каапэратываў. Тэрмін і разьмер узносаў устанаўляецца АВК. Калектыўную падпіску ў сельскіх мясцовасьцях праводзяць камісіі садзейнасьці дзяржкрэдыту і ашчадкасе, праўленьні калгасаў, арцеляў і каапэратываў, а таксама адміністрацыя прадпрыемстваў і ўстаноў. Сельсаветы і іх контрагенты прадаюць аблігацыі толькі асобным сялянам. Асобныя сяляне, якія падпісваюцца на пазыку, могуць набываць аблігацыі за плату як адразу, так і ў некалькі тэрмінаў. Калі селянін аплачвае аблігацыю па частках, дык пры кожным плацяжы яму выдаюцца аблігацыі на ўнесеную суму. Усе разьлікі павінны быць скончаны не пазьней 1-га лютага 1931 году.

Сацспаборніцтва заводаў

БАБРУЙСК, (наш кар.). Па горадзе разгарнулася кампанія рэалізацыі новай пазыкі. Рабочыя фанэрнага цэху імя Томскага пастанавілі падпісацца поўнасьцю на двухтыднёвы заработак і выклікалі на сацспаборніцтва рабочых мэблевай фабрыкі імя Хапгурына. Рабочыя заводу «Чырвоны Харчавік» падпісаліся на двухтыднёвы заработак і выклікалі на сацспаборніцтва мясцовы бровар.

Не разварушыліся яшчэ бабруйскі камбінат і шэйная фабрыка.

Па-баявому ўзяцца за работу

Падпіска на пазыку «Пяцігодка ў чатыры гады» у некаторых установах яшчэ не распачалася. Многія ўпоўнаважаныя па падпісцы нічога ня робяць. Напрыклад, у Белселькрэсьце думаюць толькі ставіць гэта пытаньне на агульным сходзе. У Лесбеле гэтай справай таксама толькі пачынаюць цікавіцца.

Але ёсьць установы, дзе ўжо праведзена шмат рэальнай работы. У гэтых установах папярэдняя растлумачальная работа ўжо скончана. Напрыклад, у НК РСІ ахоплена 75 проц. служачых, якія падпісаліся на суму 5.305 руб., што складае 72 проц. месячнага заработку. У ВСНГБ за 2—3 дні ахоплена 52 проц. супрацоўнікаў, якія падпісаліся на 11.455 руб., што складае 78 проц. іх месячнага заработку. Відаць, што дзе камісіі садзейнасьці добра працуюць, там падпіска праходзіць з посьпехам.

Камісіям садзейнасьці дзяржкрэдыту трэба па-баявому ўзяцца за работу па папярэдняй пазыкі «Пяцігодка ў чатыры гады».

Д—і.

Падпісчыкі на паперы

ВОРША, (наш. кар.). Калі праводзілася рэалізацыя трэцяй пазыкі індустрыялізацыі, дык усе супрацоўнікі калектыву АВК прынялі актыўны ўдзел у падпісцы.

Падпіска перавысіла 100 проц. месячнай зарплаты, некаторыя падпісваліся на 150 проц. Цяпер камісія садзейнасьці праверыла вынікі падпісной кампаніі. Выявілася, што некаторыя зьявіліся падпісчыкамі толькі на паперы.

Тав. Фрумкін — загадчык апэрацыйнага аддзелу дзяржкамісіі, член партыі, падпісаўся першым на 200 руб., але ніводнай капейкі ня ўнёс.

Тав. Позін — бухгальтар камісіі, падпісаўся на 50 руб. І нічога ня ўнёс.

Ніводнага ўзносу не зрабіў тав. **Мілашэўскі.**

Васютовіч, былы інафрматар АВК цяперашні кіраўнік спраў Акрпрафбюро, падпісаўся на 60 руб., але ніводнай капейкі ня ўнёс. І г. д.

Трэба ганьбаваць такіх актывістых, якія дапамагаюць дзяржаве толькі на паперы. Зразумела, рэалізацыя правядзіцца на строга добраахвотных пачатках, ніхто ня прымушае цябе падпісацца, але, калі падпісаўся, калі ласка, плаці.

ВЕДАЮЧЫ.

У часе адпачынку ў калгасе «Пралетары» (Меншчына).

Неадкладна выправіць памылкі ў правядзеньні с.-г. падатку

Перадавая «Правды» **«Лепш папярэджваць памылкі, чым потым іх выпраўляць»,** адзначае, што партыя паставіла перад кампаніяй па правядзеньні с.-г. падатку, якая мае буйное палітычнае значэньне, наступныя задачы: дапамагчы далейшай калектывізацыі вёскі, дапамагчы далейшаму разгорнутаму наступленьню на капіталістычныя элементы вёскі, ліквідацыі кулацтва, як клясы, на базе суцэльнай калектывізацыі, дапамагаючы ўздыму сельскай гаспадаркі і, ў першую чаргу, найбольш адсталых яе галін.

Зразумела, што новы с.-г. падатак будзе спрыяць вырашэньню чарговых задач партыі на вёсцы, калі практычнаму правядзеньню яго будзе адведзена даволі ўвагі.

З усёй сур'езнасьцю павінна быць пастаўлена пытаньне аб самым пільным нагляде за практычным правядзеньнем с.-г. падатку, аб своячасовым папярэджваньні розных памылак і аб неадкладным іх выпраўленьні.

На жаль, матар'ялы з месц сыгналізуюць аб пагрозе новых памылак пры правядзеньні кампаніі.

Вось, напрыклад, з **Копыскага раёну** паведамляюць, што пры вучоце аб'ектаў абкладаньня, амаль што усе аб'екты зьменшыліся, у параўнаньні з мінулым годам. Лічбовыя вынікі яўна нездавальняючыя. Яны значна адрозьніваюцца ад вынікаў вучоту ў іншых раёнах Аршаншчыны, дзе усе аб'екты далі павялічэньне.

Паводле абсьледваньня вынікаў вучоту, мясцовыя працаўнікі мэханічна, фармальна падышлі да работы, каб толькі задаволіць запатрабаваньне акрфінаддзелу. Дагэтуль вучот нідзе не скасаваны, няма штрафаў за ўтойваньне аб'ектаў абкладаньня.

Ёсьць прарывы ў абкладаньні кулацкіх гаспадарак у Копыскім раёне. 6 сельсаветаў у вызначаны тэрмін правялі кампанію па выяўленьні кулацкіх гаспадарак, выявілі каля 30-ці гаспадарак. Але раённая падатковая камісія зацьвердзіла ня ўвесь матар'ял, і пытаньне аб частцы гаспадарак перадала на дадатковае расьсьледваньне. Між тым, сярод гаспадарак, пытаньне аб якіх засталося адкрытым, ёсьць гаспадаркі, якія па сваіх адзінках, зьяўляюцца бясспрэчна кулацкімі І ў мінулым годзе былі абкладзены індывідуальна. Сьпіс выяўленых кулацкіх гаспадарак быў абгаворан на сходах беднаты і зацьверджаны сельскімі камісіямі. Чаму-ж Копыскі РВК прызнаў гэта пытаньне яшчэ нявырашаным?

Нездавальняюча праходзіць кампанія і па **Бабруйскай акрузе.** Як правіла, райвыканкомы зварочваюць на гэту справу вельмі мала ўвагі (асабліва Глускі, Асіповіцкі, Любанскі). Прымацаваныя да сельсаветаў адказныя працаўнікі райвыканкомаў амаль што зусім ня былі на мясцох, і сельсаветчыкі, асабліва новыя, робяць вялікія памылкі пры правядзеньні падліку.

Сельскія падатковыя камісіі часам працуюць без прадстаўнікоў беднаты. У выніку — утойваньне аб'ектаў абкладаньня. У Туркаўскім сельсавеце недавучот па ўсіх аб'ектах, апрача пахаці, складае каля 10 проц. РВК не скасаву гэтага вучоту.

Ня гледзячы на значнае ўтойваньне аб'ектаў, па 9-ці раёнах аштрафавана толькі 13 гаспадарак. Міхалеўскі сельсавет месяц трымаў у канцылярыі два акты пра утойваньне жывёлы, замест таго, каб адасласць іх у РВК.

Любанскі РВК не зрабіў выбарак аб заработках сялянства па калфондзе Мар'іна і недаўлічыў, такім чынам, некалькі сот тысяч рублёў прыбытку.

Падлік аб'ектаў па калгасах праводзіцца няправільна. Ільготы ім даюцца няпоўнасьцю. У некаторых сельсаветах чамусьці не вызваляюць ад падатку прырост пасеваў у калгасах, на былых кулацкіх землях, апрацаваных сіламі калгаснікаў.

Некаторыя раённыя працаўнікі дагэтуль ня ведаюць нават галоўных момантаў закону аб сельгаспадатку. Напрыклад, загадчык фінчасткі Асіповіцкага РВК растлумачыў сялянам, што ўсе калгасы вызваляюцца ад сельгаспадатку на два гады. У Многіх вёсках не растлумачаны ільготы па правядзеньне агра-зоамінімуму. У большасьці сельсаветаў сьпісы беднаты яшчэ ня складзены.

Асабліва дрэнна з індывідуальным абкладаньнем. У Чырвонаслабодзкім раёне «не знайшлі» шмат кулакоў, якія сядзяць тут-жа пад носам.

Задача сёньняшняга дня — неадкладна выправіць памылкі, вылічыць правільна падатак, папярэдзіць розныя памылкі і скажэньні пры спагнаньні падатку.

К. З.

УКАМПЛЕКТАВАНЬНЕ СЬВІНАВОДЧЫХ КАЛГАСАЎ ПРАХОДЗІЦЬ ДРЭННА

На Клімаўшчыне (Магілеўская акр.) меркавался стварыць 20 сьвінаматачных пунктаў (з 3.500 сьвінаматкамі) і 52 адкормачных пункты. У большасьці калгасаў зараз прыступлена да пабудовы сьвінарнікаў. Але дрэнна стаіць справа з набыцьцём самых сьвінаматак. Напрыклад, у калгасах «Правда» і «Рабочий» было вызначана арганізаваць па адным сьвінаматачным і адкормачным пункце з колькасьцю 100 шт. сьвінаматак, але на сёнешні дзень сьвінаматак у «Правде» — толькі 9 і ў «Рабочем»—4.

З набыцьцём сьвіней надта дрэнна і ў іншых калгасах раёну. Райкалгасаюз мала цікавіцца гэтым пытаньнем.

Н. ШЛЯХЦІЧ.

НЕ АБАРАЧАЦЬ НАВУЧАЛЬНУЮ ЎСТАНОВУ Ў СТАЛОЎКУ

У пачатку 1929-30 навучальнага году дырэктад Віцебскага яўпэдтэхнікуму тав. **Калецкі згадзіўся** аддаць падвальнае памяшканьне тэхнікуму пад студэнцкую сталоўку, якая-б абслугоўвала студэнцтва яўпэдтэхнікуму і беппэдтэхнікуму, у ліку 400 асоб.

Апрача гэтага, адсюль вывозяць каля 2000 абедаў на прадпрыемствы, у выніку чаго тут зьбіраецца шмат возчыкаў, якія падымаюць крык і перашкаджаюць заняткам.

Яшчэ ўвосені гэты дагавор праўленьнем ВЦРК быў парушаны і замест обслугоўваньня тэхнікумаў зараз там выдаюць 3.000 абедаў штодзенна.

У выніку такой нагрузкі падвальнага памяшканьня, 4 габінэты тэхнікуму зараз зачынены бо ў іх пры такіх умовах немагчыма займацца.

У тэхнікуме і ў дварэ чадна, студэнты заўсёды скардзяцца на боль галавы, — усё гэта пагражае жаснай драпрацоўцы вучэбнага матар'ялу.

Пастанова АВК аб пераводзе гэтае сталоўкі з памяшканьня тэхнікуму да гэтага часу ня выканана. ВЦРК лічыць на як мага хутчэй убраць сталоўку з памяшканьня тэхнікуму, бо гэта пагражае нармальнаму пачатку навучальнага году.

Узяць чыгунку на пралетарскі буксір!

Асеньнія перавозкі сустрэць падрыхтаванымі!

Прарывы на транспарце не ліквідаваны

ХВОРЫ ВУЗЕЛ

Безгаспадарчасьць і шкодніцтва на Віцебскім вузле

Спэцыяльная рабкораўская брыгада газэты «Віцебскі Пралетары» зрабіла «налёт» на Віцебскі вузел з мэтай выявіць, як вузел падрыхтаваны да асеньня-зімовых перавозак і як наогул пастаўлена работа на важнейшых вучастках Віцебскага чыгуначнага вузлу.

Тое, што ўбачыла брыгада, сыгналізуе аб патрэбнасьці прыняцьця рашучых мер да аздараўленьня работы на ўсім Віцебскім вузле. **На вузле—безгаспадарчасьць, галавацяпства, якое ў радзе выпадкаў мяжуецца са шкодніцтвам.**

Сярод работнікаў вузла — поўны развал дысцыпліны, адсутнічае адказнасьць адміністрацыі за працу. Партыйныя, прафэсыянальныя і камсамольскія арганізацыі замест сапраўднага жывога кіраўніцтва займаюцца папяровай перастрэлкай.

Якасьць рамонту ня вытрымлівае крытыкі

Аб тым, як паравозны парк падрыхтаваны да надыходзячых асеньніх перавозак паказваюць наступныя факты. Рамонт паравозаў дэпо Віцебск праводзіцца дрэнна. **Праграма рамонту выканана ўсяго на 87 проц.** Выпуск паравозаў з рамонту звычайна зацягваецца на 5-6 дзён пазьней тэрміну. Так, паравоз № 19/2 затрымаўся ў рамонце звыш тэрміну на 13 дзён, бо ня былі своечасова дастаўлены скаты.

За апошняга часу важнейшыя цэхі дэпо працавалі толькі ў адну зьмену, варштаты зусім не нагружаліся.

Сацспаборніцтва і ўдарніцтва разгорнута вельмі слаба. З 400 рабочых, ударнікаў лічыцца 130 чал., але іх фактычна куды менш.

Паравозы з рамонту выпускаюцца з незакручанымі гайкамі, з паламанымі часткамі, якія панава падфарбоўваюцца, каб іх не заўважылі. Аб якасьці рамонту досыць яскрава сьведчыць наступны факт. За месяц праз кантрольную будку прайшло да 185 паравозаў, з якіх каля 70 былі няспраўныя і патрабавалі рамонту, у той час, калі гэтыя паравозы былі прадназначаны для дальняга прабегу.

Шкодніцтва і падзеньне дысцыпліны

Па службе руху, брыгада рабкораў выявіла што толькі 40 проц. цягнікоў адпраўляюцца з Віцебску паводле раскладу. Плянаваясьць транспартных перавозак зрываецца. Прычына — неразьбярыха ў кіраўніцтве работай раёну і вузла і развал працоўнай дысцыпліны сярод работнікаў руху. Загадчык кандуктарскімі брыгадамі **Сіроткін і яго** памоцнік на паравозных брыгадах **Цузік** дапусьцілі поўнае падзеньне працоўнай дысцыпліны сярод кандуктароў і паравозных брыгад. Улік работы брыгад цягнікоў знаходзіцца ў таком хаосе, што зараз у ім цяжка і разабрацца. Былі, напрыклад, такія выпадкі, калі брыгады лічыліся ў адпачынку, а ім пасылаліся нарады на адпраўленьне цягнікоў з Віцебску. Брыгады часта знаходзяцца на станцыі па некалькі гадзін чакаючы цягніку, а потым цягнік адмяняецца, і брыгадзе прапануюць ісьці дамоў.

Сярод асобных рабочых машыністых ёсьць шкоднікі, якія псуюць паравозы. За апошнія 7 дзён аказаліся няпрыгоднымі для ўжываньня некалькі паравозаў з-за злачынай нядбайнасьці машыністых. Машыністы Фёдараў і яго памоцнік Басаў 20-га чэрвеня спалілі на ст. Дзедовічы паравоз № 250. Такое-ж злачынства Фёдараў зрабіў і з паравозам 19/1. І толькі 4-га ліпеня пасьля гэтых злачынстваў Фёдараў быў зьняты адміністрацыяй з працы. У Віцебску машыністы-тэхнік Фоміч, прыехаў на станцыю, ня гледзячы на зачынены сэмафор і ўрэзаўся ў папіткоцы цягнік. Такім чынам Фомін вывёў з ужываньня паравоз, які толькі - што выйшаў з рамонту. Машыністы Шырокаў разьбіў тупік і папсаваў пасажырскі паравоз сэрыі С. Такія выпадкі злачынных і шкодных адносін да паравозаў з боку машыністых былі неаднойчы.

Таварная станцыя не падрыхтавалася да асеньніх перавозак

У Віцебску зараз звалена каля 100 вагонаў розных грузаў. Камэцны вугаль, сена, бярвеньні, дошкі, цэгла — усё гэта ляжыць на станцыі вялчэзнымі масамі і з-за адсутнасьці месца грузіцца адно на другое. Саюзтранс, зусім ня вывозіць сваіх грузаў са станцыі. Напрыклад, 12-га ліпеня, ня гледзячы на «пробкі» на станцыі, працавалі ўсяго дзьве фурманкі. Выгрузку вагонаў зрывае таксама і начальнік будвучастку Доўгаў, які трымаў тры вагоны з цэмэнтам з 2 па 11 чэрвеня.

Пакгаузы «Саюзхлебу» забіты хлебам. Калі гэтымі днямі прыбыла 23 вагоны з хлебам, дык ня было дзе яго разгрузіць, і хлеб раскідалі па ўсіх пакгаузах. Што-ж будзе восеньню, у часе хлебных перавозак?

Адміністрацыя станцыі дрэнна рыхтуецца да выгрузачных апэрацый. Да перавозак патрабуецца 2.000 мяшкоў, 20 брэзэнтаў, некалькі тысяч пар рукавіц, якія да гэтага часу амаль не атрыманы. Да прыёму сэзоннікаў станцыя не падрыхтавалася, інтэрнат не пабудаваны. Станцыя абмежавалася толькі тым, што умовілася з арганізацыямі, з якіх раёнаў будзе набірацца рабочая сіла.

Ня лепш працуе кантора Арлоўскага парку, дзе скапцэнтравана кіраўніцтва ўсім рухам таварных цягнікоў і манэўразай работай. З-за несвачасовай падачы вагонаў на сартыроўку, ёсьць вялікія прастоі рабочых грузчыкаў. Вагоны ў Маркаўшчыне і ля фанэрнага заводу прастойваюць паражняком па некалькі дзён. 14-га ліпеня з Смаленску прышоў цягнік 735, які прывёз 62 вагоны, а на бездакумантнага грузу. Потым ажа залася, што 17 вагонаў павінны ісьці назад у Смаленск.

НЕПАРАДКІ НА БУДАЎНІЧЫМ ВУЧАСТКУ

Будаўнічыя работы на Віцебскім вузле праводзяцца чарапашымі тэмпамі. Пабудова Чэпінскага тупіку выканана на 10 проц., хлебнага пакгаузу ў Віцебску—на 40 проц. і г. д.

Сярод рабочых будаўнічага вучастку п'янка, гульня ў карты—частае зьявішча. У дні атрыманьня пэнсіі, палова рабочых ня выходзіць на работу. Забесьпячэньне будаўнічымі матар'ялам не выстарчальнае.

Па віне раённай канторы заработная плата рабочым выплачваецца несвачасова, дзесятнікі сыстэматычна абліччваюць рабочых. Забясьпячэньне рабочых прадуктамі дрэннае.

Партыйныя, прафэсыянальныя і камсамольскія арганізацыі не мабілізавалі своечасова масы на барацьбу з прагуламі, чырвоныя і чорныя дошкі выкінуты амаль што ўсюды, але заўсёды ніхто і ня думае.

***

На фоне гэтых агідных фактаў **рэйпраўская брыгада адзначае добрую рафту вагонных майстэрань Віцебскага вузлу.** На гэтым вучастку кіраўнікі справіліся з работай. Прамфінплян выкананы на 100 проц. Дзякуючы павялічэньню прадукцыйнасьці працы, на працягу месяца выпушчана яшчэ 4 вагоны. Прастоі пры рамонце вагонаў зьніжаны з 6,1 дня па заданьні да 4,8 дня. Замест 250 таварных вагонаў, выпушчана з рамонту 331. На рабочую сілу ў чэрвені трэба было выдаткаваць 1.478 руб., а выдаткавана 1.410 руб. Прагулы і спазьненьні на работу ліквідаваны.

Рабкораўская брыгада ў сваіх выводах лічыць, што на Віцебскім чыгуначным вузле важнейшымі вучасткамі кіруюць людзі, якія сваёй работай зрываюць сацыялістычнае спаборніцтва граюць на руку клясаваму ворагу, зрываюць выкананьне транспартнай плягодкі і ставяць пад пагрозу асеньнія перавозкі.

Рабкораўская брыгада патрабуе ад пракуратуры, партыйных і прафэсыянальных арганізацый пакласьці канец усім агідпасьцям, якія зараз адбываюцца на Віцебскім чыгуначным вузле.

Калгас «Чырвоны партызан» (Меншчына). На здымку: калгасьнікі за распрацоўкай торфу.

На вучастку перавозак становішча няспрыяючае

Пляны перавозак не даведзены да месц

17-га ліпеня ў Менску адчыніўся чарговы пленум Белбюро ЦК саюзу чыгуначнікаў.

Асноўная ўвага пленуму сканцэнтравана на пытаньні аб **асеньня-зімовых перавозках.** Даклад ўпоўнаважанага НКШЗ т. **Ледніка** і прадстаўніка Заходняга раённага камітэту па перавозках т. **Самасука** не задаволілі пленум.

Тут мы бачым зусім сумны малюнак. **Плян асеньніх перавозак ня толькі не даведзены да месц, да нізавых работнікаў, але сам Заходні раённы камітэт па перавозках, які закліканы плянаваць гэтыя перавозкі, ня мае канкрэтнага пляну.**

Аб тым, як нашы кіруючыя чыгуначныя арганізацыі плянуюць перавозкі, паказвае той факт, што толькі на пленуме яны даведаліся, што праз Жлобінскі вузел будзе перавезена некалькі мільёнаў пудоў хлеба.

Плян разьвіцьця вузлавых станцый і станцыйных лініяў пашырэньня і ўпарадкаваньня складачных памяшканьняў, забрукаваньня таварных двароў выкананы ў чэрвені толькі на 20 проц. Сродкаў-жа на выкананьне гэтай работы было адпушчана даволі.

Гаспадарчыя і загатоўчыя арганізацыі ня выконваюць дырэктывы аб узмацненьні летняга завозу масавых грузаў, як дровы, будаўнічыя матар'ялы. **Тэмпы разгрузкі і вывазкі грузаў са складаў і плацаў станцый вельмі марудныя, што зрывае работу транспарту.**

Многія станцыі, як Менск, Хойнікі 1 інш, завалены грузамі Белдзяржбуду, Белдартрапсу, Лесбелу. **На лініях станцыі Менск ёсьць каля 700 вагонаў ня вывезеных грузаў.** У сучасны момант, разгрузка праводзіцца за 5 клм. ад гораду, бо бліжэй нельга знайсьці месца.

Што-ж будзе далей, калі пачнуцца масавыя асеньнія перавозкі? Адказнасьць за загрузку станцыі цалкам узвальваецца на кліентуру. Але бязумоўна частка віны прыпадае і на чыгунку, аб чым сьведчаць кіпы актаў, якія ёсьць на руках у Лесбеле і ў іншых арганізацыях.

Рабсіла на пагрузачных работах выкарыстоўваецца нерацыянальна. На ст. Менск запрасілі 30 сэзоннікаў, але іх не забясьпечылі інтэрнатам і харчаваньнем. У Барысаве з-за непадачы вагонаў, грузчыкі штодзённа прастойваюць без работы па 3-4 гадзіны.

Прафсаюзныя арганізацыі чыгуначнікаў, мясцовага транспарту, саўгандальслужачых не мабілізавалі масы навакол пытаньняў асеньніх перавозак.

Працдысцыпліна ня толькі не палепшылася, але на радзе вузлоў—Аршанскім, Гомельскім нават пагоршылася. Паштовыя і кур'ерскія цягнікі курсуюць з частымі спазьненьнямі з-за расхлябанасьці абслугоўваючага пэрсаналу. Становішча паравознага парку не на вышыні. На Віцебскім вузле процант хворых паравозаў дасягае да 18. Якасьць рамонту паравозаў дрэнная.

Прафарганізацыі і гаспадарнікі займаюцца пытаньнямі працдысцыпліны толькі ад выпадку да выпадку. Адзінапачальле на транспарце пакуль яшчэ не адчуваецца.

Усе гэтыя факты, выяўленыя на пленуме Белбюро ЦК чыгуначнікаў, сыгналізуюць аб сур'ёзнай пагрозе пасьляховаму правядзеньню асеньніх перавозак.

Пытаньне аб падрыхтоўцы да асеньніх перавозак пастаўлена ўжо даўно, пленум спадзяваўся, што зараз чыгуначныя арганізацыі раскажуць, што практычна зроблена імі. Заслуханыя даклады і спрэчкі паказалі, што на гэтай важнейшым вучастку становішча дакука ня спрыяючае.

Рэгістраваць цяпер недахопы ўжо мала. Па іх трэба біць з усёй рашучасьцю, бо праз некаторы час будзе позна.

М. К.

Сіласны плян ня выконваецца

Замест выкананьня дырэктыў, замельна-калгасныя органы заняліся скарачэньнем заданьняў

Шмат якія зацікаўленыя цэнтральныя, акруговыя і раённыя арганізацыі ў справе сіласаваньня кармоў і сіласубудаўніцтва нічога ня робяць.

Грамадзкая думка шырокіх калгасных мас, індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, камсамольцаў не мабілізавана вакол пытаньняў сіласаваньня кармоў.

Рэальнасьць пагрозы зрыву сіласаваньня можна праілюстраваць многімі прыкладамі.

На 10-га ліпеня ў калгасах Мазырскай, Аршанскай, Менскай і Магілеўскай акруг не засіласавана ніводнай тоны. У пяці акругах заданьне па сіласаваньні выканана толькі на 0,15 проц., а ў пасасобных акругах гэты процант даходзіць да 0.

Замест выкананьня ўрадавай дырэктывы, мясцовыя арганізацыі ўрэзваюць заданьні. Менскія ўстановы, напрыклад, зьменшылі заданьне Наркамзему ў калгасах з 90 тыс. тон да 50 тысяч і ў пасёлішчах з 70 тыс. да 10 тысяч. Тое-ж самае робяць і камсамольскія арганізацыі.

Аб тым, як праходзіць тэмп сіласнага будаўніцтва, гаворыць наступнае: у 5-ці акругах Беларусі заданьне па капанньні ям і траншэй выканана толькі на 0,12 проц. Менскі акрмаляжывсаюз напічвае па ўсёй акрузе 5 сіласных ям. Шмат у якіх раёнах будаўніцтва ям і траншэй амаль што сарвана.

Паводле пастановы сіласнага штабу Наркамзему Беларусі, з 1 ліпеня абвешчан месячнік сіласаваньня. На працягу месяца павінна быць скончана будаўніцтва сіласных ям і траншэй у саўгасах на 100 проц., у калгасах на 75 проц. і ў пасёлішчах на 55 проц. Прайшло ўжо тры тыдні з моманту абвяшчэньня месячніка, а сіласнае будаўніцтва амаль што ня зрушылася з мёртвага пункту.

Паданыя вышэй некалькі лічбаў з практыкі работы пяці акруг з усёй яскравасьцю падкрэсьліваюць бязьдзейнасьць і абыякавыя адносіны да справы з боку большасьці райтэаў камсамолу і пасасобных райкомаў партыі. Адно ясна, што ўся работа па сіласаваньні ідзе самацёкам, бяз усякай плянавасьці. Наркамзем, Белкалгасбуд, Белкалгасцэнтр не зрабілі патрэбных захадаў, каб праверыць, як на мясцох выкананы шматлікія дырэктывы ўраду і Наркамзему аб своечасовым будаўніцтве і сіласаваньні кармоў у пэўныя тэрміны. Калгасы, саўгасы, камсамольскія ячэйкі не зрабілі крутога павароту да сіласнай кампаніі.

На Бабруйскі дрэваапрацоўчы камбінат ускладзена адказная задача—даць да 25-га ліпеня 160 стандартных сіласных вежаў. Беладрэўны цэх камбінату, які выабляе вежы, прыняў на сябе заданьні. Былі створаны спэцыяльныя ўдарныя брыгады, заключана сацспаборніцтва на хутчэйшае выкананьне заданьня. Парт'ячэйка стварыла спэцыяльную тройку. Адміністрацыя камбінату пры прыёме заданьня заявіла, што яна да гэтай справы падрыхтавана і што першую партыю вежаў камбінат здасьць да 5-га ліпеня.

Што-ж аказалася ў сапраўднасьці? Замест першай партыі вежаў, камбінат праз тыдзень дае ў Маскву тэлеграму: «Галоўнае затрыманьне ў выраабе вежаў—адсутнасьць трансфарматараў», а таму камбінат выпусьціць першую партыю на месяц пазьней і скончыць выпуск усяго камплекту вежаў капя 1-га кастрычніка, калі будуць трансфарматары.

Такім чынам, камбінат выпусьціць вежы ў такі тэрмін, калі ня будзе чым іх засіласаваць. Дзе-ж былі бабруйскія камсамольскія арганізацыі? Што зрабіў ВСНГБ для таго, каб праверыць ход вырабу вежаў на камбінаце?

Ня лепш абстаіць справа з падрыхтоўкай кадраў па сіласаваньні. Паводле пастановы Наркамзему, праз курсы павінна быць прапушчана 3.500 чалавек, на сёнешні дзень прапушчана ня больш 1.000.

Такая маруднасьць у справе вырашэньня кармавой праблемы ставіць пад пагрозу ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі аб жывёлагадоўлі.

Трэба з усёй рашучасьцю біць па ўсіх недахопах у справе сіласаваньня і сіласнага будаўніцтва.

Справу сіласаваньня трэба ўзяць на грамадзкі «буксір», каб найхутчэй ударнымі тэмпамі скончыць і выканаць плян сіласаваньня і сіласнага будаўніцтва.

К.

Камсамольская арганізацыя ў баку

У Гарадоцкім раёне намячалася пабудова сіласных вежаў і ям на 360 тон. Заданьне разьмеркавалі па асобных калгасах. Аднак, у большасьці калгасаў да будаўніцтва ям і вежаў нават ня прыступілі. З боку райкалгасаюзу няма патрэбнага кіраўніцтва, не хапае дэмэнту, каменьня і іншых будаўнічых матар'ялаў. Камсамольская арганізацыя стаіць у баку ад гэтай справы і не пасабляе калгасьнікам будаваць сіласныя ямы. Сярод калгаснікаў праведзена слабая растлумачальная работа. Аб гэтым сьведчыць вруй раённых курсаў па сіласаваньні. Замест 40 асоб, па курсы прыбыло толькі 9. Большая частка калгасаў не дала слухачоў на гэтыя курсы, бо лічыць гэту справу лішняй.

Брыгадзір «Зьвязды» ПРАКАПОВІЧ.

РВК і Райкалгасаюз бязьдзейнічаюць

Дрысеньскі райвыканком і райкалгасаюз у галіне сіласаваньня бязьдзейнічаюць. Адкрыліся курсы для падрыхтоўкі работнікаў па сіласаваньні, але на курсы замест 43-х чалавек, зьявілася 7 чалавек.

Трэба прыняць рашучыя меры, каб папярэдзіць поўны зрыў пляну сіласаваньня ў Дрысенскім раёне.

Брыгадзір «Зьвязды»

Завод „Пралетары“ ня мае пяцігадовага пляну

Бясплянавасьць давяла завод да буйных непаладак і перабояў у рабоце

Гомельскі завод **«Пралетары»** апошнія гады працуе ў вельмі ненармальных умовах. Перш за ўсё гэты завод **ня мае ня толькі пяцігодкі, але і наогул у апошнія гады працуе без усялякага пля



У кожным горадзе павінны быць стадыёны і «дамы фізкультуры». Дом фізкультуры ў Бабруйску.

69 РЭЙДАЎ

Кожны работнік друку і рабселькор павінен скарыстаць багаты вопыт работы Харкаўскіх ударнікаў

Шырокі размах сацыялістычнага будаўніцтва ставіць з усёй вострасьцю і рашучасьцю пытаньне аб новых мэтадах рабселькораўскай работы, якія-б адпавядалі шырокім запатрабаваньням рэканструкцыйнага пэрыяду.

Задачы нашага друку, у прыватнасьці і рабселькораў у даны момант значна павялічыліся і паглыбіліся. Ад пасыўнага фіксаваньня фактаў мы павінны перайсьці і пераходзім да сапраўднай арганізацыі работы на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва.

Пастановы XVI зьезду УсеКП(б) і хёзуцр «сацыялістычнага наступленьня па ўсяму фронту» яшчэ з большай вострасьцю ставяць перад намі пытаньне перабудовы рабселькораўскай работы, якая-б адпавядала важным пастановам партыі.

Новыя формы і мэтады работы ў нас яшчэ зусім мала распрацаваны, але той маленькі каштоўны вопыт, які мы ўжо маем, таксама не даведзен да работнікаў нізавога друку і да кожнага паасобнага рабселькора.

З мэтаю азнаямленьня работнікаў друку і рабселькораў з багатым вопытам новых мэтадаў работы харкаўскіх ударнікаў «Правды», выдавецтва ЦК УсеКП(б) «Правда» выпусьціла ў сьвет другім выданьнем брашуру тав. Ярміла-ва і Магіда «60 рейдов».

У той час, калі яшчэ ні адна газэта і ня думала аб брыгадным мэтадзе работы, першая ўдарная брыгада харкаўскіх рабкораў «Правды» выйшла ў свой першы рэйд супроць бюракратызму, інэртнасьці, бесгаспадарнасьці, супроць усіх відаў парушэньняў дырэктыў партыі і ўраду.

Шмат перашкод сустрэлі на сваім шляху першыя піянэры-ударнікі, але бальшавіцкая настойлівасьць перамагла ўсе гэтыя цяжкасьці.

Цяпер у Харкаве няма ні аднаго вучастку савецкага будаўніцтва, партыйнай работы, эканомікі, вытворчасьці і г. д., якія-б ня былі закрануты ударнікамі «Правды». За «60 рейдов» імі абсьледвана 200 устаноў і шмат фабрык і заводаў.

Змаганьне за генэральную лінію партыі, выяўленьне шкодніцтва ва Украінскім Наркамземе, чыстка харкаўскай акрфінчасьці — усё гэта толькі паасобныя моманты работы харкаўскіх ударнікаў.

Гэтыя ударныя брыгады моцны яшчэ і тым, што яны ня спыняліся на голым фатаграфаваньні фактаў, а здолелі паказаць розным арганізацыям як Саюзхлебу шляхі арганізацыі работы, «якімі горамі можна варочаць», калі ў аснову работы пакласьці ленінскі прынцып — веру ў сілы мас, патрэбныя тэмпы работы, якія-б адпавядалі патрабаваньням вялізарнейшых задач рэканструкцыйнага пэрыяду.

У гэтай кніжцы чытач знойдзе шмат такіх прыкладаў у іх рабоце.

Апрача значэньня кніжкі, як паказальніка новых форм работы рабселькораў, яна набывае вялікую вартасьць для партыйных, прафесыянальных і савецкіх арганізацый, бо ў ёй паказваецца на фактах, як мы павінны арганізоўваць кадры рабочых ад варштату, паказваецца штоденны кантроль рабочых фабрык і заводаў над савецкім апаратам.

Кніжка чытаецца параўнальна лёгка і з вялікім захапленьнем, бо яна заражае чытача энэргіяй, захапляе сваімі жывымі прыкладамі работы, выклікае ў чытача бязьмежную цягу да сапраўднабальшавіцкай масавай работы.

Гэта кніжка павінна стаць настольнай кнігай кожнага члена рэдкалегіі і рабселькора.

Работнік друку і рабселькор павінен ведаць пра вопыт харкаўскіх брыгад, што значна дапаможа ў яго рабоце.

І. Л—іч.

Працяг канфэрэнцыі-нарады аб выніках агляду грамадзкага харчаваньня адбудзецца 21 ліпеня а 6-й гадзіне увечары ў залі пасяджэньня ЦСПСБ.

Прысутнасьць аглядавых брыгад абавязкова.

Запрашаюцца рабочыя і служачыя.

ЦП саюзу саўгандальслужачых сёньня, 20 ліпеня склікае 1-ю УСЕБЕЛАРУСКУЮ НАРАДУ РАБОЧЫХ-ВЫЛУЧЭНЦАЎ з наступным парадкам дня:

1. Папярэднія вынікі чысткі дзяржапарату (дакл. НК-РСІ і садклад ЦП саюзу).
2. Выбары дэлегатаў на 1-ю Усесаюзную нараду вылучэнцаў.

Нарада адкрываецца сёньня а 7-й гадз. веч. у памяшканьні клюбу саўгандальслужачых (рог Энгельса і Камуністычнай).

На адчыненьне запрашаюцца ўсе рабочыя-вылучэнцы, што працуюць у савецкіх, гаспадарчых установах, рабочыя і ФЗМК прадпрыемстваў, прафактыў саюзу і кіраўнікі адміністрацыйных, каапэрацыйна-гаспадарчых устаноў г. Менску.

Усім АПС і МК саюзу забясьпечыць сваячасовую яўку дэлегатаў на нараду.

Інтэрнацыянальны вечар МОПР'у

Аўторак, 22 ліпеня

Клюб Акрвыканкому (Пляц Волі)

Менскі акруговы камітэт МОПР'у

праводзіць

ВЯЛІКІ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНЫ ВЕЧАР

прысьвечаны прыезду групы кітайскіх рэвалюцыянэраў.

На вечары выступяць прадстаўнікі кітайскай кампартыі і камсамолу.

Білеты на інтэрнацыянальны вечар можна атрымаць у ячэйках і райкомах МОПР'у.

ПАЧАТАК роўна а 7 гадз. веч.

Мен. АК МОПР'у.

Неўзабаве вырасьце Дом друку

На зьмену старым „саматужным" друкарням

У сучасны момант у Менску існуюць дзьве друкарні. Адна—з колькасьцю рабочых у 560 чал., другая — 50 чал. Памяшканьні друкарняў — жыльлёвага тыпу, з сыстэмай пакояў, зусім не дапасаваных да вытворчасьці. Аднавіць, адрамантаваць іх нельга, бо яны напалову спарахнелі.

За выключэньнем 9 лікатыпаў і 5 плоскіх машын, тэхнічнае абсталяваньне ў вытворстве 25-30 год і зусім знасілася.

Між тым, у 1931 годзе нашымі выдавецтвамі мяркуецца выпусьціць газэтнай прадукцыі 130,2 млн. водціскаў, часопісяй — 100,9 млн. водціскаў, кніг і брашур — звыш 200 млн. водціскаў.

Зусім зразумела, што такім тэмпам выдавецкай справы павінны поўнасьцю адпавядаць умовы паліграфічнага вытворства. Ужо на 3-м годзе пяцігодкі наша паліграфічная база ня здолее задавесьціць мінімальныя запатрабаваньні ў друкаваным слове.

Таму і насьпела пабудова Дому друку. Закладка яго павінна была адбыцца 11 ліпеня. Але, на жаль, на гэтае вялікае пачынаньне не адгукнуліся, як належыць, адпаведныя арганізацыі. «Зьвязда» паведамляла ўжо аб тым, што на ўрачыстую закладку Дому не зьявіўся ніхто з прадстаўнікоў АВК, АК КП(б)Б, ЦСПСБ у той час, калі рабочыя-друкары прышлі, як адзін.

Паводле плянавых меркаваньняў, у Доме друку па Барысаўскім тракце будуць разьмешчаны ўсе выдавецтвы г. Менску. У адным з карпусоў будзе зьмяшчацца вялікая друкарня — агульная для ўсіх выдавецтваў.

Прапускная здольнасьць гэтае друкарні падвысіцца ў параўнаньні з цяперашняй у два разы. У два разы павялічыцца і плошча, якую будзе займаць гэты корпус.

Прадпрыемства цалкам мэханізуецца. У ім будуць пастаўлены новыя плоскія машыны з саманакладкай, агрэгат, загудуць 3 новыя лінатыпы. У друкарні будуць працаваць больш 600 рабочых.

Аднэй з бязумоўных выгад будзе зьяўляцца тое, што рэдакцыі непасрэдна зьвяжуцца з вытворчасьцю, будуць фактычна працаваць побач, пад адным дахам.

Закладка адбудзецца ў бліжэйшыя дні.

Адкрыцьцё Дому друку зьявіцца сьвятам для ўсіх працоўных БССР. Яно прыстасоўваецца да Кастрычніцкіх сьвят 1932 году.

Юр. Л—ны.

Будаўніцтва бульбахавальнікаў—пад пагрозай

Набліжаецца час загатовак бульбы, а з будаўніцтвам бульбахавальнікаў, якое праводзіцца Белпладгароднінай і Беллаўдсаюзам, справа абстаіць зусім дрэнна. Па лініі будаўніцтва «Плодагароднины» асноўнай небясьпекай зьяўляецца недахват будаўнічых матар'ялаў. Саюзлес не выдае нарадаў на піламатар'ялы, ня гледзячы на наяўнасьць фонду і прыраўнаньне гэтага будаўніцтва да будаўніцтва збожжавых складаў. Белпайгандаль, ня гледзячы на распараджэньне Дзяржпляну, не выдае цьвіков і сартавога жалеза. Несвячасовае забесьпячэньне песаматар'ялам зрывае будаўніцтва бульбахавальнікаў.

Па лініі Паляводсаюзу меркавалася будаваць па пляне 10 бульбахавальнікаў, пачалося будаўніцтва толькі 2-х. Па асноўных бульбяных раёнах Бабруйшчыны і Гомельшчыны з вызначаных 4-х бульбахавальнікаў ня будуецца ніводзін, ня гледзячы на тое, што грошы ўжо адпушчаны.

Трэба зьвярнуць увагу грамадзкасьці на гэту справу, трэба прыняць тэрміновыя меры, каб унікнуць зрыву будаўніцтва бульбахавальнікаў.

Прыём падросткаў у фабзавуч чыгункі

У гэтым годзе ў першую клясу Менскай школы фабзаўчу МБВ чыг. будзе прынята 150 чалавек. У першую чаргу прымаюцца дзеці рабочых і служачых чыгункі, потым дзеці рабочых, выхаванцы дзетдамоў, дзеці інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў занятых на вытворчасьці, былых паліткатаржан, батракоў і кальгасьнікаў.

Усе паступаючыя ў школу павінны быць на ўліку біржы працы.

Як нельга право дзіць крэдытную рэформу

Крэдытная рэформа прадугледжвае, што ўсе разрахункі паміж установамі праводзіцца праз банк у тых мэтах, каб фінансаваньне сацыялістычнага сэктару праводзілася выключна праз крэдытныя ўстановы.

Для таго, каб ліквідаваць запазычанасьць устаноў, НК РСІ і Дзяржбанк вырашылі ліквідаваць узаемазапазычанасьць ва ўсім абагуленым сэктары шляхам перадачы запазычанасьці ў Дзяржбанк.

Зараз ліквідацыя ўзаемных разьлікаў стала першачарговай задачай кожнага прадпрыемства і асабліва органаў банку.

Здавалася-б, што Дзяржбанк павінен быць зацікаўлены ў тым, каб мінулая запазычанасьць была безадкладна перададзена яму, каб бягучыя фінансавыя узаемаадносіны паміж установамі ня выклікалі росту «ведамственнай запазычанасьці».

Што-ж мы маем на справе?

Перад намі факты, якія гавораць аб тым, што беларуская кантора Дзяржбанку не праводзіць, як належыць, крэдытнае рэформы.

Вось, напрыклад, Дзяржбанк заплаціў два разы, як аб гэтым прыняла рад довадаў Белпчаціна, за адзін і той-жа самы тавар, першы раз 10 чэрвеня па рахунку Невельскай шчацінпай фабрыкі, другі раз 14 чэрвеня па рахунку Невельскай арцелі інвалідаў.

На жаль, Дзяржбанк аднёсься фармальна да гэтай справы і замест ліквідацыі запазычанасьці паміж установамі, пастанавіў лічыць другі рахунак звычайнай прэтэнзіяй, якая павялічвае узаемазапазычанасьць паміж Белпчацінай і інвалідамі, і паслаў арцелі інвалідаў прапанову зьвярнуць грошы.

Такім чынам, Дзяржбанк садзейнічае не ліквідацыі запазычанасьці, а яе росту.

Прапнова Дзяржбанку аб адлясеньні памылковага рахунку да прэтэнзій ёсьць чыста чыноўніцкая прапанова. Такіх памылак у далейшым дапускаць нельга.

ГУЛІС.

Шляхі ленінградзкога ТРАМ'у

У той час, калі стары тэатр стаяў на раздарожжы, ня ведаючы куды ісьці, просты гурток рабочае моладзі вырас і арганізаваўся ў тэатр. Паступова з жывой газэты нарадзілася п'еса з скважнымі дзеяньнямі і з простай інтрыгай. З 1925 году пачынаецца сталая праца тэатру. Але камсамольцы-рабочыя не пакідаюць вытворчасьці, днём на вытворчасьці, вечарам у тэатры. Толькі ў 1928 годзе, паводле пастановы Ленінградзкага абласнога камітэту камсамолу, трамаўцы зьнімаюцца з вытворчасьці і атрымліваць магчымасьць цалкам аддацца тэатру.

Малады камсамольскі калектыў адразу па-новаму падышоў да тэатральнай работы, ён адразу стаў мастацкім агітпропам камсамолу. Адлюстроўваючы ў сваіх п'есах жыцьцё і быт камсамолу, барацьбу за ўдарныя брыгады, за сацспаборніцтва, за здаровага новага жывога чалавека, ён змагаецца з правымі і «левымі» апартуністымі — за генэральную лінію партыі.

Карыстаючыся ўсімі мэтадамі выразнасьці, ідучы супроць непатрэбнага эстэтызму, ТРАМ ставіць сваёй мэтай даць глядачу завостраны сацыяльны вобраз у больш зразумелай форме.

Мэтад працы тэатру — мэтад дыялектычнага матэрыялізму. Ён ня блукае ў псыхалёгічных завулках «гэрояў». Цікава тое, што, працуючы бытавой вытворчай камунай, тэатр шляхам дыспутаў перадае свой вопыт глядачу.

Бадзёра і гучна сьмяючыся над недахопамі ў быце, ТРАМ паказвае праблему сям'і і калектыву. Гэтаму прысьвечана п'еса «Плавяцца дні».

ТРАМ зрабіў спробу арганізаваць новую камсамольскую апэрэту.

Даць гледачу лёгкі і вясёлы адпачынак, цікавую музыку, карыстаючыся новымі мэтадамі, выпрацаванымі калектывам, — вось галоўная мэта пастаноўкі «Дружная горка».

Клясавая барацьба ў вёсцы, калектывізацыя, не шабленны, а жывы падыход да сучасных падзей у вёсцы, — вось тэма п'есы «Цаліна».

Усе гэтыя п'есы напісаны драматургамі самога тэатру, афармлены і пастаўлены рэжысэрамі і мастакамі калектыву ТРАМ.

Яз. Д—скі.

Прыступіць да перавыбарчай кампаніі МОПР'у

З 1-га жніўня на ўсёй Беларусі пачынаецца перавыбарчая кампанія мопраўскіх арганізацый.

Перавыбарчая кампанія ў гэтым годзе праводзіцца ў пэрыяд абвостранай клясавай барацьбы замежнага пралетарыяту і працоўнага сялянства з капіталізмам, у умовах растучага эканамічнага крызісу капіталізму ў процівагу СССР, дзе ўсё больш і больш разгортваецца сацыялістычнае будаўніцтва.

У зьвязку з гэтым і ў мэтах поўнага забесьпячэньня пасьпяховага правядзеньня перавыбарчай кампаніі, мопраўскія арганізацыі павінны ў час правядзеньня справаздач канцэнтраваць грамадзкую думку вакол важнейшых пытаньняў сацыялістычнага будаўніцтва, у першую чаргу на пытаньні выканаўня прамфінпляну, калектывізацыі сельскай гаспадаркі, шырокага распаўсюджваньня пазыкі «Пяцігодка за 4 гады».

Таксама мопраўскія арганізацыі павінны шырока асьвятляць сучасныя ўмовы барацьбы рабочай клясы і працоўнага сялянства ў краінах капіталу (разгул белага тэрору, забастоўкі, стачкі, рост беспрацоўных і г. д.).

Справаздача перавыбарчай кампаніі павінна праходзіць у шырокім разгортваньні крытыкі і самакрытыкі, для гэтага неабходна скарыстаць у гэту кампанію ўсіх членаў МОПР'у на 100 проц. Гэту кампанію неабходна таксама скарыстаць для колькаснага павялічэньня раду МОПР'у за лік рабочых прадпрыемстваў і саўгасаў, працоўнага сялянства і ў першую чаргу сялян калгаснікаў і жанчын. Неабходна прыняць пад увагу аб упягненьні ў рады МОПР'у членаў КСМ і рабочай моладзі, бо колькасьць рабочай моладзі ў мопраўскіх арганізацыях вельмі малая.

У мэтах шырокага асьвятленьня дзейнасьці мопраўскіх арганізацый трэба добра скарыстаць мясцовую прэсу, насьцегазэты і шматтыражкі.

Акруговы камітэт МОПР'у ужо вырашыў пытаньне аб выпуску да перавыбарчай кампаніі аднаразовую газэту ў ліку 15.000 экз., мопраўскім арганізацыям патрэбна безадкладна прыслаць матар'ял, які будзе высьвятляць усю іх дзейнасьць.

Для таго, каб у перавыбарчай кампаніі маглі-б прымаць удзел шырокія колы працоўных, АК МОПР'у вырашыў пашырыць модус прадстаўніцтва на раённыя і акруговыя канфэрэнцыі ў наступным парадку: на вясковыя раённыя канфэрэнцыі ад 25 членаў МОПР'у абіраюцца 2 дэлегаты, у горадзе па кожных 50 членаў — 1 дэлегат. Для большай пасьпяховасьці правядзеньня справаздачна-перавыбарчай кампаніі неабходна ўсім партыйным, прафесыянальным, камсамольскім і інш. грамадзкім арганізацыям прыняць актыўны ўдзел у правядзеньні гэтай важнай палітычнай кампаніі.

С. БРАЙНІН.

Алімпіяда мастацтва ў Маскве. На здымку: Першы Беларускі Дзяржаўны Тэатр.

На здымку: нядаўна пабудаваны клюб хэмікаў

Спыніць зьнішчэньне дрэванасаджэньняў

У Менску, з-за шпаркага разгортваньня будаўніцтва, катастрафічна зьмяншаецца плошча дрэванасаджэньняў. Дрэванасаджэньне і раней зьяўлялася самым «вуакім» месцам у гарадзкім дабрабыце, але зараз зьнішчэньне дрэваў прыняло зусім недапушчальны характар. Зразумела, што гэта адбіваецца на дабрабыце гораду, на здароўі працоўных. Вось, напрыклад, у садзе «Прафінтэрн» знайшліся будаўнікі, якія злачынна псуюць дрэванасаджэньні.

Там будуюцца нейкія часовыя буфэты. Гэтыя буфэты займаюць вялікую плошчу і тым зьмяншаюць вялікую прастор, яны псуюць дрэванасаджэньні. У якасьці стоек скарыстоўваюцца жывыя дрэвы.

Чаму ЦСПСБ, які зьяўляецца гаспадаром саду, не клапоціцца аб ахове яго і дапушчае паступовае звужэньне адзінага ў горадзе месца адпачынку?

СІМАНЧЫК.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

СЁНЬНЯ

Сад Асьветы. Кіно—«Мёртвая пятля». Пачатак а 10 гадз. веч.

Дом Асьветы. А 7 г. веч. адбудзецца нарада кіраўнікоў культасьветных груп ГК, МК, прадстаўнікоў ад бюро ячэек Асоавіяхіму, МОПР'у і т-ва па садзейнічаньні калектывізацыі с.-г. саюзу працасьветы. У парадку дня: Аб правядзеньні Міжнароднага Чырвонага дня 1-га жніўня. На нараду запрашаюцца сакратары ГК, МК або іх намесьнікі.

У нядзелю, 20 ліпеня, 1930 г. а 7 гадз. увеч. у памяшканьні акруговага камітэту МОПР'у адбудзецца напаўпрыватнае пасяджэньне **Фрунзаўскага РК МОПР'у.** Яўка членаў райкому абавязкова. Запрашаецца актыў.

* * *

Сёньня, 20 ліпеня, а 7 гадз. увеч. адбудзецца пасяджэньне прэзыдыуму **Кастрычніцкага РК МОПР'у.** Павінны зьявіцца члены прэзыдыуму райкому і ўсе члены райкому. Запрашаецца мопраўскі актыў.

ЗАЎТРА

Дом Асьветы. 21 ліпеня біб-ка Дому Асьветы пасьля перапынку пачынае працаваць кожны дзень з 6 да 10 гадз. веч.

Пэдгабінэт. А 19 г. сход працаўнікоў дзіцячых пляцовак і садоў. Распрацоўка пляну далейшай работы.

Ад камісіі па чысткі апарату Галоўдартрансу.

З 19 ліпеня ў клюбе саюзу будаўнікоў (Вул. Энгельса, 13) пачалася чыстка апарату Галоўдартрансу. Праверку будуць праходзіць т. т. Бельчунас, Шэйкоўскі, Віктараў і Пагарэльцаў.

Просьба да рабочых будаўнікоў, су. працоўнікаў Галоўдартрансу і ўсіх жадаючых прыняць актыўны ўдзел у чысткі. Пач. а 7 г. веч.

Дом Асьветы. 23 ліпеня адбудзецца экскурсія тэхнічных працаўнікоў членаў саюзу працасьветы г. Менску ў лягэры. Збор а 7 гадз. раніцы ў Доме Асьветы.

Ад Мен. АКК КП(б)Б. Мен. АКК КП(б)Б на 23 ліпеня, а 6-ай гадз. вечары выклікае на пасяджэньне парт. тройкі наст. т. т.: **Серадніцкага М. І.**—(яч. Белпайгандлю), **Ізоха К. Р.**—(яч. Гуты «Пралетары»), **Ждановіча М. А.**—(яч. «Чырвонная Бярэзіна»), **Васілеўскага В. М.**—(яч. ст. Барысаў МБВ.). **Чысьцякова А. А.**—(яч. Барысаўскага вузла), **Войтава Т. А.**—(ячэйкі «Прафінтэрн». Барысаў), **Гузмана Б. А.**—(яч. ЦРК, Барысаў), **Хахлова А. С.**—(яч. Белсельсаюзу, Барысаў), **Варашылава А. Р.**—(ячэйкі ВСНГБ), **Чыжа С. А.** — (ячэйкі ф-к «Кастрычнік»), **Сівеца Г. В.**—(яч. ф-к «Камінтэрн», Барысаў), **Сушкевіча А. А.** — (ячэйкі ВСКО), **Даньковa У. С.**—(яч. Наркамзему), **Сукоўскага П. А.**—(яч. акрэа), **Міціна М. М.**—(Заслаўскі раён), **Цяплова П. В.**—(Койданаўскі раён), **Зотава А. А.**—(Копыльскі раён).

Акрамя таго на пасяджэньне павінны зьявіцца сакратары гарадзкіх ячэек (гор. Менску) выклікаемых т. т. і старшыні правяркомаў.

Час. вык. абав. адказ. рэдактара А. МІТЛІН.

ЦП саюзу гарбароў і саўгандальслужачых склікаюць 22 ліпеня а 7 гадз. веч. у клюбе саўгандальслужачых КАНФЭРЭНЦЫЮ ЎДАРНІКАЎ РАБОЧЫХ: заводу «Бальшавік», абутковай ф-кі, Гандальбуду і супрацоўнікаў абутковых крам МЦРК, па пытаньні аб якасьці вырабу скур. тавараў.

Акрамя ўдарнікаў зав. «Бальшавік», абутковай ф-кі, Гандальбуду і ўсіх супрацоўнікаў абутковых крам МЦРК, якія павінны абавязкова зьявіцца на канфэрэнцыю, запрашаюцца прадстаўнікі: ВКО Бел., НК РСІ, Белскуртрэсту, Наркамгандлю, праўленьня МЦРК, БКС, Белсамцрамсаюзу, прадстаўнікі друку і рабочыя-спажыўцы.

Сёньня, а 7 гадзіне вечара ў памяшканьні рэдакц. газ. «Зьвязда» склікаецца

агульна-гарадзкі сход рабкораў і членаў рэдкалегій Менску.

Парадак дня:

1. Міжнародны «Чырвоны дзень» і задачы рабкораў.
2. Аб удзеле рабкораў у выданьні газэты пры Усебеларускай выстаўцы.

Яўка абавязкова.

Сэнтар масавай работы рэдакцый газэт «Зьвязда», «Рабочий» і «Акцябр»

Рэдакцыя газ. «Зьвязда» 22-га ліпеня склікае нараду па пытаньні

аб падрыхтоўцы да новага навучальнага году

Нарада адбудзецца ў памяшканьні рэдакцыі „Зьвязда" (Савецкая, 63, 3-ці паверх), а 7 гадз. веч.

На нараду запрашаюцца прадстаўнікі: Наркамасьветы, Культадзелу ЦСПСБ, ЦБ пралетстуду, Наркамзему, ВСНГ, АК КП(б)Б, АК ЛКСМБ, рэктары БДУ, ВТНУ, Камвуз, дэканы факультэтаў, заг. тэхнікумаў і рабфакаў, Калгасасаюзу, Белкавасаюзу, Белдзяржбуду, прадстаўнікі зав. «Энэргія» і «Бальшавік».

Кіно-тэатр „Культура"

Бытавая драма ў 8 частках

ГІЛЯНАВА ДАЧКА

— ЗВЫШ ПРАГРАМЫ —

апошняе дасягненьне тэхнікі Цудоўныя цені

Для ўспрыняцьця эфэкту „Цудоўныя цені", кожны глядач атрымлівае спэцыяльныя акуляры ў касе кіно-тэатру за плату 7 к.

Пачатак сэансаў: 7 г. 30 м., 9 і 10 г. 30 м.

КІНО інтэрнацыянал

СЁНЬНЯ ЗВЫШ ПРАГРАМЫ

экстраны выпуск КІНО-ХРОНІКІ алімпіяда мастацтваў

На экране мастацкі фільм вытворчасьці ДзяржКінпром-Грузіі

ЭЛІСО

Пачатак 1-га сэансу а 7 г. 30 м.

Каса—ад 5 г. 30 м.

КІНО пралетары

СЁНЬНЯ ЗВЫШ ПРАГРАМЫ

экстраны выпуск КІНО-ХРОНІКІ алімпіяда мастацтваў

На экране: новая выключная амэрыканская камэдыя

Шумныя суседзі

(з-за спадчыны)

Пачатак 1-га сэансу а 7 г. 30 м.

Каса—з 5 г. 30 м.

КІНО-САД

Выключна мастацкі фільм з гішпанскага жыцьця

ДОНА ЖУАНА

ў 9 частках.

Пачатак 1-га сэансу а 10 гадз.

Каса адкрыта з 6 гадз.

КІНО „СПАРТАК"

З панядзелка, 14 ліпеня

З прычыны вялікага посьпеху 2-гі ТЫДЗЕНЬ 2-гі ТЫДЗЕНЬ

Нашумеўшы фільм

АЛІМ

драма ў 10 частках.

Пачатак сэансаў: 7 г., 9 г. і 11 г.

Каса—ад 6 гадз.

СЁНЬНЯ, 20 ліпеня, а 7 гадз. веч.

ў сэдзе КАМУНАЛЬНІКАЎ (Нова-Маскоўская № 18)

склікаецца

агульны сход членаў і жыхароў ЖАКТ'у № 7

У ПАРАДКУ ДНЯ — справаздача брыгады па праверцы работы праўленьня.

У выпадку дрэннага надвор'я сход будзе перанесены ў клюб КАМУНАЛЬНІКАЎ—Няміга, 8.

ПРАЎЛЕНЬНЕ.

ПРАВІЛЫ ПРЫЁМУ

ў Скрыгалаўскую прафшколу гідратэхнікаў і культуртэхнікаў

на 1930-31 навучальны год

1. У прафшколу прымаюцца асобы ад 14 да 18 год, якія скончылі (незалежна ад году скончэньня) поўны курс 9-годкі, 2 ступені, 2-гадовых адукацыйных курсаў, 7-годкі, школы для дарослых навышанага тыпу, школы сялянскай моладзі, прафшколы на базе 4-годкі, пасьля 3-х год вытворчага стажу, і курсы па падрыхтоўцы ў тэхнікумы.

УВАГА: вытрымаўшыя іспыты ў 1928-29, 1929-30 г. г ды паступленьні аслабяняюцца ад іспытаў.

Прыём заяў пачынаецца з 15-га ліпеня па 1-га жніўня г. г.

2. Дакументы прыкладаюцца ў арыгіналах, за выключэньнем вайсковых: а) дакумант аб узросьце (мэтрыка), б) аб адносінах да вайсковай павіннасьці (для мужчын), в) аб асьвеце, г) дзьве фатаграф.-карткі, д) мэдычнае пасьведчаньне аб стане здароўя, е) дакумант аб сацыяльным і матар'яльным становішчы паступаючага і яго бацькоў пасьля рэвалюцыі і да рэвалюцыі, ж) даведка аб тым, што паступаючы і яго бацькі не пазбаўлены выбарчых правоў, з) для сялян—акладны ліст на 1929-30 год, а для саматужнікаў—патэнт, і) анкету, пасьведчаную прафэсыянальнымі або савецкімі арганізацыямі, к) паштовых марак на адказ на 30 кап.

3. Тэрмін іспытаў і залічэньня ўстанаўліваецца з 1-га па 10 жніўня г. г.

Пачатак заняткаў з 1-га кастрычніка.

Заявы накіроўваць па адрасе: Скрыгалаў, Мазырскае акругі, Прафшкола

ПРАФШКОЛА.

ЗАВОЧНЫЯ БУХГАЛЬТАРСКІЯ КУРСЫ

Прыём слухачоў праводзіцца круглы год.

Прымаюцца асобы з 17-гадовым узростам з асьветай ня ніжэй 5 гр. 7-годкі.

ПЛАТА ЗА КУРС 33 руб.

праводзіцца так: 9 руб. пры паступленьні на курсы, з якіх 4 руб. залічваюцца за 8-м месяц і па 4 руб. на працягу 6 месяцаў у пачатку кожнага навучальнага месяца

Заявы, запытаньні і грошы накіроўваць па адрасе: Менск, пошта, скрынка 44, Завочным курсам.

На адказ прыкладаць 2 маркі па 10 кап.

БЕЛАРУСКАМУ ДЗЯРЖАЎНАМУ ВЫДАВЕЦТВУ ПАТРЭБНЫ на сталую працу

стыльрэдактары і карэктары,

якія вольмі добра ВЕДАЮЦЬ БЕЛАРУСКУЮ МОВУ і ПРАВАПІС.

Залічэньне на працу будзе адбывацца пасьля спробнае работы.

Залічаным на працу ПРАЕЗД БУДЗЕ АПЛАЧАНЫ.

АПЛАТА працы: стыльрэдактара—140 руб. на месяц. карэктара —120 руб. „

Апрача гэтага ДАЕЦЦА ЗЬДЗЕЛЬНАЯ СТЫЛЬРЭДАКЦЫЯ І КАРЭКТУРА.

Аплата зьдзельнае ст. рэдакцыі: 5, 7 і 10 руб. за аркуш, карэктуры—2, 5 і 3 руб. аркуш.

З прапановамі зьвяртацца ў выдавецкі аддзел БДВ, Савецкая, 63.

ВЫШЛІ З ДРУКУ

і прадаюцца ва ўсіх кнігарнях БДВ і крамах спажыўкаапэрацыі:

В. СТАШЭЎСКІ.

ПРЫСЯГА Ў ЛЕСЕ.

Стар. 35. Цана 30 к.

Б. ЖЫТКОЎ.

ТЭЛЕГРАМА.

Стар. 34. Цана 13 к.

БЕ ЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА.

ПРАПАЎ САБАКА

карычневай масьці з белымі плямамі, пароды «Пантэр», клічка БАЯН. Просьба паведаміць па адрасе: Савецкая, 87|19. кв. 10, Харытоненай (ва дварэ, кіно «Пралетары») за ўзнагароду. За утайку буду прасьледваць па закону

МЯНЯЮ 2 пакоі ў Магілеве ў цэнтры на 1 або 2 пакоі ў Менску.

Зварачацца па адрасе: Менск, Маскоўская, 28, кв. 1, Аверскі.

АД'ЯЖДЖАЮЧЫ Ў ВОДПУСК

у дом адпачынку, на курорт,

атрымлівайце газ. „ЗЬВЯЗДА"

па месцы знаходжаньня ў водпуску,

паведаміўшы ў аддзел падпісі газ. «ЗЬВЯЗДА»

ВАШ НОВЫ АДРАС.

Газэта будзе дасылацца на новым адрасе

без асобнай даплаты.

Для здачы ВВЕСТКІ ў газэту „ЗЬВЯЗДА" званіце па тэл.

7-81

Даводзіцца да ведама зацікаўленых асоб і устаноў, што, згодна пастановы агульнага сходу членаў ЖАКТ'аў № 1 і № 18,

АПОШНІЯ ЗЬЛІВАЮЦЦА Ў АДЗІН ЖАКТ № 1

з 1 ЛІПЕНЯ 1930 г.

Па ўсіх справах зварачацца ў канцылярыю ЖАКТ'у № 1—Інтэрнацыянальная, 8

ПРАЎЛЕНЬНЕ.

СЕКАРОВСКАЯ ЖИДКОСТЬ

МОСКВА 55 2-я ВЫШЕСЛАВЦЕВ ПЕР. № 6

ГЭТЫМІ ДНЯМІ ВЫХОДЗІЦЬ З ДРУКУ

КУРС КАМЭРЦЫЙНЫХ ВЫЛІЧЭНЬНЯЎ

В. Т. Вайтэнка

Дапамажэнік для ВНУ, бухг. курсаў, тэхн. і спэцыясаў.

ЦАНА 2 руб. 50 кап.

Заказы і грошы накіроўваць па адрасе: Менск, пошта, скрынка 4)4